№№39–40
(2559–2560)

9 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

БЛІЦ

У 2008 годзе павінны адбыцца чарговыя выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу

На Ваш погляд, якія канкрэтныя захады неабходна зрабіць апазіцыі і ўсяму беларускаму грамадству, каб выбары прайшлі не пад дыктоўку тых сіл, якім патрэбны не дэмакратычны, а «кішэнны» парламент?

Леанід ЛЫЧ, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук:

— Я лічу, што і сама апазіцыя павінна быць не такая, якая ёсць: яна больш змагаецца сама з сабой, чым за агульную справу. Апазіцыя павінна быць апазіцыяй, павінна весці за сабой народ. А я не ведаю, чым кіруецца апазіцыя ў сваіх цяперашніх дзеяннях.

У нас гістарычна склалася прорва паміж інтэлігенцыяй і народам. Пачынаючы з 1569 года інтэлігенцыя служыла палякам, Рэчы Паспалітай, а з 1795 года — двухгаловаму расійскаму арлу. Таму на падсвядомым узроўні склаўся недавер да інтэлігенцыі. А беларуская апазіцыя — гэта ў большасці інтэлігенцыя. Народ не вінаваты ў тым, што інтэлігенцыя нічому не навучыла яго.

...Быў адзін палітык, за якім асабіста я пайшоў бы. Гэта — Генадзь Карпенка. Улады пралічылі гэта і знішчылі яго. А больш няма за кім ісці...

Віктар КАРНЯЕНКА, адзін са стваральнікаў незарэгістраванага руху "За свабоду!":

— Свабодныя выбары — гэта і ёсць тая ідэя, вакол якой мы прапануем аб'яднацца. Нам трэба дамагацца правядзення выбараў па стандартах АБСЕ, трэба, безумоўна, вярнуцца да чатырох умоў, якія Еўрапейскі Саюз выстаўляе да афіцыйнага Мінска. Такія шансы ў звязку з палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі зменамі ў краіне з пачатку 2007 года ў нас ёсць, хай сабе і невялікія. Сёлета ўсё ж адбыліся пэўныя змены (улада нервуецца, кідаецца з боку ў бок у пошуках крэдытаў), што дае нам дадатковыя шансы.

Але перадумова ўсяму гэтаму — адзінства сярод Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Я магу выказаць вельмі асцярожны аптымізм, што ўдасца знайсці згоду паміж сабой і скіраваць свае намаганні менавіта на галоўную задачу.

РЭЖЫСЁР аднаго з мінскіх тэатраў, які пажадаў захаваць ананімнасць:

— Я не ведаю адказу на ваша пытанне. Я палітыкай не займаюся. Для мяне палітыка — гэта мае спектаклі, на якія прыходзяць 400—500 чалавек. Мяне палохае не столькі палітычная сітуацыя, колькі амаральнасць, у тым ліку і ў палітыцы. Шмат хто, нават вядомыя людзі, не ходзяць у тэатры, не ходзяць у філармонію. Затое я часцяком бачу іх на прыёмах, калі яны стаяць у чэргах да стала. Дык вось адзін такі мой знаёмы сказаў, што ў тэатр хадзіць яму няма калі. А на прыёмы час ёсць?!

Галоўнае, па-мойму, быць чыстым у палітыцы. Менавіта на гэтую якасць розных кандыдатаў трэба звяртаць увагу падчас любых выбараў.

Аляксандр ЯРАШУК, лідэр Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў:

— Палітычны працэс у Беларусі спыніўся больш за год таму. З гэтай прычыны не было ніякага сэнсу ўдзельнічаць ні ў прэзідэнцкіх, ні ў мясцовых выбарах. Тое самае можна гаварыць і аб парламенцкіх выбарах 2008 года. Такая мая асабістая пазіцыя.

Можаце крытыкаваць яе: як тады прыйсці да ўлады, калі не ўдзельнічаць у выбарах? Лічу, што зрабіць гэта звычайным дэмакратычным шляхам проста немагчыма. І сваім няўдзелам мы проста падаём сігнал свайму народу і міжнароднай супольнасці, што Беларусь — краіна, дзе спыніўся палітычны працэс.

Міхаіл ВЕЛЯСНІЦКІ, падсобны рабочы, 21 год:

— У мяне жонка цяжарная, хутка роды. Таму ўся гэтая палітыка мяне не хвалюе: мне трэба рыхтавацца да павелічэння сямейства і зарабляць грошы.

Уладзімір НІСЦЮК, кіраўнік партыйнай групы "Узаемадапамога і салідарнасць" БСДП (Грамада), выканаўчы дырэктар Дабрачыннага фонду выпускнікоў сувораўскіх і нахімаўскіх вучылішч "Выратаванае пакаленне":

— Ад беларускай апазіцыі зараз мала што залежыць. Мы ператварыліся ў маргіналаў, загналі сябе ў вугал, а таму не можам паўплываць на прынятае якіх-небудзь дзяржаўных рашэнняў. Хутка пачнуць гаварыць у адказ на ваша пытанне: "Трэба мяняць заканадаўства". Пытанне — як? "Трэба вылучаць людзей у выбарчыя камісіі". Тое ж пытанне: як?

Адзінае, што трэба рабіць (і на гэта арыентуюся і я сам, і мае аднадумцы), — ісці да людзей і рыхтаваць для сябе акругі зараней. Пры відавочнай перавазе нейкага канкрэтнага кандыдата фальсіфікацыя вынікаў выбараў немагчыма ў прынцыпе. Трэба ісці да канкрэтных людзей, аказваць канкрэтную дапамогу і толькі так заваёўваць давер людзей. Гэта адзіны бяспройгрышны варыянт. А паездкі па рэгіёнах нічога не дадуць. Вось паехаў Мілінкевіч у Магілёўскую вобласць, сустрэўся з двума-трыма дзесяткамі сваіх аднадумцаў. А толк які?

Васіль АЛЯКСЕЕЎ, урач:

— Калі б апазіцыя хацела ўзяць уладу — даўно б узяла.

***

АД РЭДАКЦЫІ. А якія вашы меркаванні, шаноўныя чытачы? Пагадзіцеся, хоць да выбараў у парламент час яшчэ ёсць, але, як сведчыць вопыт, яго можа і не хапіць для адказу на лёсавызначальныя пытанні, калі, вядома, усё адкладваць на апошнія месяцы.

Пішыце нам, тэлефануйце. Вашы думкі абавязкова знойдуць адлюстраванне на старонках "Народнай волі".

ЖУРНАЛИСТСКОЕ РАССЛЕДОВАНИЕ

Любовь ТОЗИК:

«У нас нет такого большого чемодана, куда можно положить 10 миллионов долларов...»

*Не так давно некоторые сайты распространили "сенсационную" новость — сотрудники белорусской таможни якобы изъяли у посла Беларуси в Китае **Анатолия ТОЗИКА**... 10 миллионов долларов.*

«Да его за такое на нары нужно!»

Первым эту скандальную новость поведал сайт *www.ucpb.org: "Как сообщили наши источники во властных структурах, на днях, когда посол Беларуси в Китае Анатолий Тозик вылетал из Минска в Пекин, таможня проверила его дипломатический багаж. Сделано это было по указанию Виктора Шеймана... Таможенная проверка, все по той же неофициальной информации, нашла у Анатолия Тозика 10 миллионов долларов наличными (видимо, брал с собой на чужбину на карманные расходы). Теперь предполагаемые расходы придется существенно ограничить: Лукашенко, с которым связались по телефону, приказал денежки изъять, а самого Тозика отпустить в Пекин с миром. Во всяком случае пока что".*

Заметка с сайта *ucpb.org* быстро разлетелась по Интернету. "Новость" стали обсуждать не только на различных форумах, но и в коридорах власти. Отдельные чиновники (между прочим, очень хорошо знакомые с Анатолием Тозиком) в приватных беседах искренне возмущались: *"И этот человек еще совсем недавно возглавлял Госконтроль! Да его за такое на нары нужно!"*

"Народная воля" решила провести свое журналистское расследование: имел ли вообще место этот инцидент? На самом ли деле у Анатолия Тозика изъяли 10 миллионов долларов?

Проверить сложно

Администрация сайта *www.ucpb.org* сообщила, что какими-то дополнительными подробностями и фактами, связанными с "досмотром" Тозика, не обладает.

"Периодически к нам поступает самая разная информация о чиновниках от приближенных к ним людей, — пояснили администраторы сайта. — *И часто информация подтверждается. Что касается Тозика, то если такой факт и был, то, конечно, подтвердить его очень сложно. Во всяком случае у нас подтверждающей информации нет..."*

«Если его досмотрят — будет большой скандал»

В Государственном таможенном комитете Беларуси "Народной воле" официально заявили следующее:

"Нам не известен факт досмотра сотрудниками белорусской таможни руководителя белорусской дипмиссии в Китае. Посол — это лицо, которое обладает большим дипломатическим иммунитетом. Если его досмотрят — будет большой скандал. Поэтому мы ставим под сомнение достоверность информации, появившейся в Интернете. Вообще, за последние годы не было случая, чтобы таможенники проверяли дипломатический багаж послов западных государств, не говоря уже про своих. Это нарушение всяческих конвенций! Если прецеденты и случались, то главным действующим лицом в них был не посол, а, скажем, второй секретарь какого-то посольства".

«Ерунда какая-то!»

Начальник отдела пресс-службы Министерства иностранных дел **Мария Ваньшина** сказала, что в МИДе вообще не понимают, о чем идет речь в информации упомянутого сайта.

"Ерунда какая-то!.." — сказала Мария Михайловна.

А другой чиновник МИДа в разговоре с журналистом "Народной воли" заметил, что в Интернете информация о Тозике появилась еще до того, как Анатолий Афанасьевич прилетел в Минск.

«Это было в начале года...»

Когда информацию о "миллионах" Тозика официально никто не подтвердил, "Народной воле" из других источников сообщили, что в заметке на сайте www.ucpb.org все напутано. И что данный факт якобы все же имел место. Но только не на минувшей неделе, а *"в начале этого года"*, когда Анатолий Тозик приезжал в Минск в командировку.

Мы решили выяснить и этот факт: когда именно в предпоследний раз Тозик приезжал в Беларусь? И снова позвонили в МИД. Там сообщили, что до этого посол Беларуси в Китае приезжал в Беларусь летом минувшего года — вместе со всеми другими белорусскими дипломатами, которых собирал МИД.

Об этом, кстати, "Народной воле" рассказала и супруга Анатолия Афанасьевича, которой мы также задали вопрос про *"изъятые миллионы"*.

«У каждого человека есть враги...»

— Да, мы тоже такое читали, — сказала Любовь Романовна, отвечая на вопрос "Народной воли". — Думаю, эту информацию писал не очень умный человек. 10 миллионов в чемодане! Дочка говорит: мама, у нас даже нет такого большого чемодана, куда можно положить 10 миллионов долларов. Ну что тут скажешь — это просто смешно...

— А как Вы можете объяснить появление подобной информации?

— Наверное, у кого-то имеется какой-то интерес к Анатолию Афанасьевичу. Может, кто-то ему завидует. У каждого человека есть враги...

— Расскажите, как Вам в Китае работается...

— Нормально. Главное, что я рядом с мужем и он — рядом со мной. Мы прожили уже сорок лет, но за эти годы никогда не проводили так много времени вместе. Ну, может быть, только в первые годы совместной жизни. Я когда-то даже маме пожаловалась, что редко вижу мужа, что он слишком много времени проводит на работе. И моя мудрая мама сказала: ты должна понимать, что даже если его назначат сельским учителем, ты будешь мужа видеть только ночью... Поэтому сейчас я просто счастлива. Спасибо судьбе, которая в конце нашей жизни предоставила нам такой удивительный шанс... Я снова увидела мужа таким, каким он был сорок лет назад...

— Но Анатолию Афанасьевичу и сейчас приходится немало работать. Его сравнительно недавно назначили, но в Китай, наверное, не без его помощи, уже успели съездить очень многие чиновники.

— Ну что поделать, если по жизни он трудоголик... Я к этому уже, наверное, привыкла. Он говорит, что я у него на втором месте после работы...

— Любовь Романовна, а Ваш супруг уже вернулся в Китай?

— Нет, он еще немного побудет в Минске...

Марина КОКТЫШ.

ТЕМНАЯ ИСТОРИЯ

Белорусский след в гибели российского журналиста?

Прокуратура Москвы возбудила уголовное дело по факту гибели корреспондента "Издательского дома "Коммерсант" Ивана Сафронова. Дело возбуждено по статье 110 УК РФ — "доведение до самоубийства".

Выяснение обстоятельств случившегося еще продолжается, проводится опрос свидетелей, близких и друзей погибшего. Выясняется, что Сафронов делал до гибели, с кем встречался. Тем временем само издание уже имеет свою версию причин произошедшего.

Военный обозреватель газеты "Коммерсант" 51-летний Иван Сафронов трагически погиб 2 марта. Он выпал из окна дома №9 на Нижегородской улице, в котором проживал, и от полученных травм скончался на месте. Однако в самом "Коммерсанте" в гибели Сафронова видят белорусский след.

Выяснилось, что погибший военный обозреватель накануне своей смерти занимался темой поставок оружия на Ближний Восток. Как рассказывал Иван Сафронов, он получил информацию о новых поставках российского оружия в страны Ближнего Востока (в Иран и Сирию) через Беларусь.

"Перед отъездом в командировку в ОАЭ на международную выставку вооружений IDEX-2007 (она открылась 17 февраля) Иван Сафронов говорил, что будет проверять полученную им информацию о возможных новых поставках российского оружия в Ближневосточный регион. По его словам, речь шла о продаже партии истребителей Су-30 в Сирию и зенитных ракетных комплексов С-300В в Иран. Причем в обоих случаях, по его информации, поставки должны были идти через Беларусь, чтобы Запад не обвинил Москву в вооружении странизгоев", — пишет "Коммерсант".

После возвращения из Объединенных Арабских Эмиратов Иван Сафронов на работу не вышел — из-за обострения язвы взял больничный. После пресс-конференции главы российской Федеральной службы по военно-техническому сотрудничеству Михаила Дмитриева, на которую Иван Сафронов пошел, журналист рассказал коллегам, что у него появилась информация о том, что между Россией и Сирией уже подписаны контракты на поставку зенитных ракетно-пушечных комплексов "Панцирь-С1", истребителей МиГ-29 и оперативно-тактических ракет "Искандер-Э".

Рассказав коллегам об имевшейся у него информации по "Искандерам", Иван Сафронов сказал, что пока писать об этом он не будет, потому что его предупредили: в случае огласки будет большой международный скандал, а ФСБ возбудит уголовное дело по факту разглашения гостайны. Кто именно предупреждал его о возможных проблемах, Иван Сафронов не уточнил.

В тот же день Иван Сафронов звонил в редакцию и предупредил, что он продиктует статью по белорусской схеме поставок оружия в Сирию и Иран. Однако в редакцию этот материал так и не поступил.

Олег СНОВ.

Усіх лідэраў — на жывадзёрку!

Суб'ектыўныя ўражанні ад з'езда сацыял-дэмакратаў

Вячаслаў ОРГІШ, *доктар філасофскіх навук*

У палітычным супрацьстаянні беларускага рэжыму і апазіцыі з'явілася дадатковая інтрыга. Чарговы з'езд Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), што прайшоў 4 сакавіка ў Мінску, абраў Аляксандра Казуліна на пасаду старшыні партыі.

Зыкатлівае пытанне

Цепер у турме сядзіць не проста былы экс-кандыдат у прэзідэнты, які падчас выбарчай кампаніі 2006 года сваімі неардынарнымі ўчынкамі ўскалыхнуў палітычнае жыццё краіны і прымусіў галоўнага фаварыта прэзідэнцкай гонкі сур'езна панерваваць.

Цяпер за кратамі ўтрымліваецца кіраўнік палітычнай арганізацыі, якую грамадскасць успрымае як частку сацыял-дэмакратычнай супольнасці, партыйныя структуры якой вызначаюць палітычны курс у многіх краінах Еўропы і Амерыкі.

Перад "Чырвоным домам" паўстае зыкатлівае пытанне: што рабіць далей з палітычным вязнем №1? Працягваць трымаць яго ў калоніі — значыць блакіраваць нармалізацыю адносін з Захадам, паколькі ў абмен на эканамічную дапамогу той дамагаецца дэмакратычных перамен, і ў першую чаргу вызвалення палітычных вязняў. Выпусціць Казуліна з турмы — значыць, пагадзіцца з тым, што ў шэрагі апазіцыі вернецца лідэр, здольны разварушыць яе, схіліць да рашучых дзеянняў.

Сярод удзельнікаў з'езда адразу ж пайшлі размовы аб тым, што быццам улада ў якасці кампрамісу можа абраць перавод старшыні БСДП (Грамада) на так званую "хімію".

Аднак палітычная ды маральная салідарнасць грамадоўцаў са зняволеным лідэрам ці не адзінае, што не выклікае пытанняў у таго, хто быў сведкам нядзельнага мерапрыемства. Дэлегат з Барысава Аляксандр Абрамовіч, які больш за іншых настойваў на абранні Казуліна старшынёй "Грамады", яшчэ заклікаў з'езд усім складам ісці на Кастрычніцкую плошчу сталіцы і патрабаваць ад улады неадкладнага вызвалення Аляксандра Казуліна. Заклік не знайшоў падтрымкі (маўляў, няма дазволу на мітынг).

У перапынку я спытаў у сп.Абрамовіча, ці праўда, што яму належыць жартаўлівае выказванне: "Казуліна — у старшыні партыі, усіх астатніх яе лідэраў — на жывадзёрку!" Сп.Абрамовіч не стаў аспрэчваць аўтарства, а толькі паправіў мяне: "На палітычную жывадзёрку!" Гэты злы жарт, мяркуючы па ўсім, адлюстроўвае агульную незадаволенасць шараговых сябраў тым, што адбываецца ў "вярхах" партыі.

На вялікі жаль, чарговы з'езд сацыял-дэмакратаў у чарговы раз прадэманстраваў, што некалі ўплывовая партыя левага накірунку перажывае паралюш волі. Яе цэнтральны апарат працуе неэфектыўна, партыйныя функцыянеры ўсё часцей даюць падставы падазраваць іх у карупцыі. Партыйны арганізм усё больш і больш набывае рысы паўмаргінальнай і бездапаможнай палітычнай секты. Партыйная наменклатура засяроджана на ўнутраных канфліктах, групавых інтарэсах і практычна не мае часу і сіл займацца арганізацыяй галоўнага — змагання з аўтакратыяй, барацьба за аднаўленне палітычнай ды сацыяльнай дэмакратыі з года ў год адкладваецца. Гэта якраз тое становішча, якое ўлада ўвесь час імкнецца навязаць сваім палітычным праціўнікам.

Чаму так адбываецца

Мне неаднойчы даводзілася пісаць аб праблемах, якія працяглы перыяд скаланаюць "Грамаду". Яшчэ ў чэрвені 2004 года адбыўся з'езд партыі, на якім гэтыя праблемы апынуліся ў цэнтры ўвагі. Ужо ў той час партыйнае кіраўніцтва, партыйная эліта дэманстравалі хваравіта абвостраную цікаўнасць да размеркавання і перараздмеркавання пасад і партфеляў у партыі і фактычна адсунулі на другі план галоўныя палітычныя мэты. Тагачасны старшыня партыі Мікола Статкевіч быў абвінавачаны ў аўтарытарызме, наўмысным размеркаванні функцый партыйнага кіравання сярод вузкага кола набліжаных з ліку сталічных партыйцаў, на яго ўсклалі віну за адсутнасць значных вынікаў палітычнай дзейнасці партыі. Атаку на цэнтр узначалілі Анатоль Ляўковіч (на той час лідэр Брэсцкай абласной партарганізацыі) і Уладзімір Нісцюк, які працаваў намеснікам старшыні партыі.

"Рэгіёны рвуцца да ўлады" — так называўся мой артыкул у "Народнай волі", у якім я распавёў чытачам аб ідэйных і маральных калізіях узгаданага з'езда "грамадоўцаў". Прайшло зусім мала часу, і рэгіяналы разам з зацікаўленымі гульцамі з іншых апазіцыйных груповак дамагліся свайго: Мікалай Статкевіч быў адхілены ад кіраўніцтва БСДП (НГ), яе лідэрам стаў Аляксандр Казулін. На першыя кіруючыя ролі ў партыі высунуліся Аляксей Кароль, Уладзімір Нісцюк, Мечыслаў Грыб, Алег Трусаў ды іншыя ветэраны беларускай сацыял-дэмакратыі. Больш за ўсіх выйграў Анатоль Ляўковіч. Паколькі Казулін сканцэнтраваўся на прэзідэнцкай кампаніі, а пасля яе заканчэння трапіў за краты, лідэр брэсцкіх сацыял-дэмакратаў, які атрымаў пасаду першага намесніка старшыні партыі, паступова пераняў функцыі яе кіраўніка і менеджэра. Аднак, не зважаючы на шматгадовую спрактыкаванасць у партыйных гульнях, яму так і не ўдалося суцішыць супярэчнасці і канфлікты паміж найбольш амбіцыёзнымі дзеячамі "Грамады". Больш за тое, ён сам апынуўся ў эпіцэнтры партыйных спрэчак і разборак. Вельмі падобна, што на з'ездзе адбылася своеасаблівая кульмінацыя шматгадовага крызісу партыі, адказнасць за які сярод іншых, безумоўна, ляжыць і на Ляўковічу.

Чаму менавіта крызісу? Таму што ўсе апошнія гады партыя, як ужо адзначалася, марнавала энергію на ўнутраную валтузню і разбуралася. У выніку, як паведаміў на з'ездзе сп.Ляўковіч, апошняя рэвізія партыйных шэрагаў паказала, што ў "Грамадзе" рэальна засталося паўтары тысячы партыйцаў, а налічвалася дзве з паловай тысячы.

Чаму кульмінацыя? Таму што з'езд важыўся вывесці за рамкі працэсу партыйнага кіравання значную частку старой партнаменклатуры, амбіцыі якой перашкаджаюць, як вынікае з даклада выконваючага абавязкі старшыні БСДП (Г) Ляўковіча, плённай працы партыі. Па сутнасці, асноўныя клопаты галоўнага дакладчыка, як і ўсяго з'езда, былі скіраваны на вырашэнне гэтай задачы. Таму пытанні эфектыўнасці ўдзелу сацыял-дэмакратаў у сістэмнай палітыцы, авалодвання імі палітычнай ды сацыяльнай ініцыятывай у краіне засталіся па-за парадкам дня партыйнага мерапрыемства. А шкада.

(Працяг на 2-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 САКАВІКА 2007 г.

ПРОДОЛЖЕНИЕ ТЕМЫ

В предыдущих номерах “Народная воля” в очередной раз вернулась к теме пенсионного обеспечения в Беларуси. Сегодня наш собственный корреспондент в Англии рассказывает о том, по каким правилам формируется пенсия у англичан.

Выйдя на пенсию, бывший муж купил себе дом во Франции

“Обаятельная блондинка 63 лет познакомится с мужчиной, не утратившим способность радоваться жизни во всех ее проявлениях”.

Это объявление я нашел в газете “The Times” и подумал — а почему бы и нет? Возраст у дамочки пенсионный, но, судя по тону объявления, жизнь бьет ключом!

О чем вы, дорогие читатели, сейчас подумали? О радостях жизни во всех ее проявлениях? Ух, неугомонные... Вам бы все клубнику со взбитыми сливками... А я, между прочим, не какой-то там “казанова кривоногий”, а серьезный журналист! И интерес у меня к этой дамочке возник чисто профессиональный, в контексте редакционного задания — написать статью о пенсионной системе Великобритании. А что может быть лучше рассказа о системе на примере отдельно взятого реального пенсионера?

Короче, набрался я смелости и... позвонил.

— Здравствуйте, — говорю. — Вы давали объявление в газету?

— Да, — слышится в трубке. Голос у женщины такой жизнерадостный, азартный. — А вы тот мужчина, который не утратил способность радоваться жизни?

— Способность не утратил, — отвечаю.— Но звоню вам по другому поводу...

И скороговоркой объясняю, кто я и с какой целью набрал номер ее телефона.

— Простите, — говорит она. — При чем тут пенсия? Я давала объявление о том, что хотела бы познакомиться.

— Ну и это тоже, — выкручиваюсь я. — Одно другому не мешает.

— Вы иностранец, не так ли? — спрашивает дама. — Из какой страны?

— Из Беларуси, — отвечаю я и обреченно думаю, что сейчас она прочтет лекцию о политесе и пошлет... к батьке.

— О, как интересно! — говорит она. — А я была в Минске! В 1996 году мы привозили гуманитарную помощь жертвам чернобыльской катастрофы!

Оказалось, Линда Смолли, так зовут мою собеседницу, — бывшая учительница географии, участвует в работе благотворительной организации, которая занимается оздоровлением белорусских детей. В 2003 году в ее доме месяц гостила девочка из Гомельской области.

— Мы с Машей до сих пор переписываемся! А в 2004 году я даже ныряла в бассейн с акулами, представляете? — засмеялась Линда. — А еще была такая специальная акция, мы собирали деньги для детской больницы в поселке Мир, кажется. Знаете такой поселок?

Она щебетала и щебетала. Чувствовалось, что питает нежные чувства к Беларуси и белорусским детям.

— А помню, мы были в Лапичах... Впрочем, об этом я вам потом как-нибудь расскажу, — сказала она. — Приезжайте 14 февраля. Записывайте адрес.

В День Святого Валентина я выехал в Истборн — небольшой курортный городок на берегу Ла-Манша. За час неутомительной поездки в электричке я успел перелистать несколько брошюрок о пенсионной системе Великобритании, изданных Департаментом социальной защиты. Выяснил, что первая всеобщая государственная система пенсий была введена в Туманном Альбионе после Второй мировой войны. Всех работодателей и их сотрудников обязали делать отчисления в Национальный страховой фонд. Средства этого фонда направлялись на различные социальные нужды (выплаты по болезни, безработице, обеспечение пенсий для вкладчиков по достижении мужчинами 65-летнего возраста, а женщинами — 60-летнего). Размеры пенсий и сегодня зависят от рабочего стажа. Минимальная пенсия составляет 75 фунтов в неделю, максимальная — 95.

Разумеется, этих денег не хватает на покрытие всех нужд пенсионера. Чтобы обеспечить достойный уровень жизни в старости, многие вступают в корпоративные пенсионные фонды. К примеру, сеть супермаркетов “ТЕСКО” имеет свой пенсионный фонд, из которого сотрудники, вышедшие на пенсию, получают денежное содержание, в 2 раза превышающее государственную пенсию. Можно также воспользоваться услугами частных пенсионных фондов, большинство из которых субсидируется государством. И, прошу заметить, безопасность вкладов гарантируется государством! Никто не скажет вам в случае чего: а мы вас в этот фонд денежку нести не заставляли...

Разумеется, из скупых текстов Департамента социальной защиты трудно понять, какие статьи расходов покрывает минимальная государственная пенсия, а какие — нет. И как покрывается то, что остается без покрытия? Это прежде всего квартплата, коммунальные услуги, стоимость медицинского обслуживания, проезд в общественном транспорте... Ответы на эти вопросы я и надеялся получить у моей новой знакомой.

В 15.30 электричка Лондон—Истборн остановилась у перрона, по которому вальяжно разгуливали толстые чайки, то ли недовольно покрикивая на приезжих (дескать, понаехали тут), то ли жалуясь на “неурожай” рыбы в море.

В 16.00 я стоял на ступеньках “Гранд-Отеля”, сжимая в руках розу, и гадал: в “карете” прикатит моя “Синдерелла” или “пешим строем”. По наличию или отсутствию у нее автомобиля можно догадаться об уровне благосостояния пенсионерки. Ведь машина в хозяйстве — это масса дополнительных неучтенных расходов.

Обаятельная блондинка 63 лет подрулила к парадному подъезду на “Ниссан-Альмера” 2003 года. Белое пальто, черные брюки, оранжевая блузка, в руках сумочка от “Луи Виттон”. Анорексией явно не страдает, но и не “гамбургер”. Если б не знал, сколько ей лет, сказал бы, что леди в полном расцвете сил.

Сели за столик. Она заказала джин-тоник, уточнив, чтобы джин был марки “Бомбей сафайя”.

— А вы, конечно же, будете водку? — лукаво улыбаясь, спросила она. — Я знаю, в вашей стране все пьют водку.

— Но поскольку я не в своей стране, то предпочел бы виски, — отвечаю.

Выпив за Международный день всех влюбленных, мы перешли к разговору о пенсионной системе.

Линда сказала, что размер пенсии, которую ей платит государство по возрасту, — 95 фунтов в неделю, то есть 380 фунтов в месяц.

— Это, конечно, небольшие деньги, — сказала она. — Но поскольку я отработала 40 лет в школе, то получаю в дополнение к государственной пенсии учительскую корпоративную, которая составляет 50% от моей заработной платы. Это 15.000 фунтов в год. В месяц выходит около 1200 фунтов. А в сумме с государственной — 1580 фунтов.

В этом месте по праву автора хочу внести некоторое пояснения: 1580 фунтов —- очень неплохие деньги даже для семьи. Я получаю те же деньги, работая! Плюс я должен платить за арендуемую квартиру 890 фунтов ежемесячно, плюс налог на недвижимость. А Линда имеет собственный дом, т.е. платит только налог на недвижимость, который, поскольку она живет не в Лондоне, значительно меньше того, который плачу я, житель столицы.

Итак, из 1580 фунтов пенсии Линда платит ежемесячно:

налог на недвижимость — 70 фунтов;

коммунальные услуги — 50;

телефон — 30;

продукты питания — 250—300;

содержание автомобиля — 200—250;

спутниковое телевидение — 35 фунтов.

Получается, что после всех необходимых выплат у пенсионерки остается 850 фунтов.

Линда, выйдя на пенсию, не закрылась за дверями собственного дома. Каждый месяц она покупает абонемент в бассейн. Это еще 32 фунта, а также обязательно посещает салон красоты. На косметологические процедуры уходит фунтов 100 ежемесячно. Кроме того, моя новая знакомая — член клуба любителей вина. Она ежемесячно заказывает по каталогу клуба 12 бутылок белого и красного вина, что обходится ей в 60—70 фунтов.

По пятницам женщина встречается с друзьями в пабе. Не отказывает себе в посещении парикмахерской, театров, любит сходить на концерт, побывать на стадионе (Линда — фанатик регби). В общем, каждый месяц она откладывает на банковский счет 500 фунтов.

Разумеется, при необходимости она может урезать свои расходы. К примеру, Линда собирается продать свой “Ниссан-Альмера”, поскольку последние три года она по 6 месяцев путешествует и машина стоит в гараже. А за страховку все равно надо платить, плюс дорожный налог...

— Может быть, куплю машинку поменьше, — делится своими планами Линда. — А вообще, у меня как у пенсионерки бесплатный проездной билет на все виды транспорта и скидки на междугородные переезды. Машина мне не очень-то и нужна...

Линда собирается продать свой дом (5 спален) и купить другой — с двумя спальнями. Рыночная стоимость ее дома 370—400 тысяч фунтов. А “двуспальный” обойдется тысяч в 180—200. Таким образом появятся дополнительные 200 тысяч, как говорят англичане, на “дождливый день”.

— Большой дом —- большие расходы, — говорит Линда. — Дети давно выросли, у всех свои семьи. Я живу с собачкой и кошечкой. Нам 5 спален и две ванные комнаты ни к чему. К тому же путешествую по полгода. Была в Австралии, Новой Зеландии, проехала всю Азию. Теперь в моих планах — Южная Америка... Собственно говоря, я и задержалась-то в этом году, чтобы продать дом и машину. Я уже присмотрела себе маленькое уютное бунгало... Хотите, покажу? Это здесь недалеко, ближе к морю.

Заказав по второму кругу виски, я осмелел.

— Давайте поговорим о личной жизни. Вы же были замужем?

— Ну конечно, была! Даже дважды. Откуда же, вы думаете, у меня три дочки? — призналась Линда. — Первый муж был офицером Британской армии. Майор, шотландский горный стрелок! Но он давно на пенсии.

— А какая у него пенсия?

— О, военные в нашей стране чувствуют себя прекрасно! Мой муж (мы, кстати, с ним давно в разводе) получил при выходе на пенсию единовременное пособие — 200.000 фунтов и с новой женой уехал во Францию в 1986 году. Купил там шикарный дом, почти замок, и разводит уток... Фермерствует! Пенсия у него — 2500 фунтов в месяц. А второй муж ушел на пенсию в 45 лет. А я, к примеру, в 60.

— Неужели это возможно? — удивился я.

— Почему нет? — теперь очередь Линды удивляться. — Он работал в Сити, в одной из финансово-инвестиционных компаний. Вкладывал деньги в какие-то акции и неплохо зарабатывал. К 45 годам у него накопилась весьма приличная сумма, и он решил, что ему хватит на жизнь, если разумно распоряжаться капиталом. А уж он это дело знает!

— А если человек в своей жизни ну совсем ни дня не работал, стажа трудового не имеет? Как тогда ему живется на пенсии? — продолжаю расспрашивать я.

— Есть у меня один пример из жизни, — отвечает Линда. — Перед пенсией я учила в колледже беженцев английскому языку. И в моей группе учились супруги то ли из Молдовы, то ли из Украины... К моменту получения вида на жительство они уже были людьми глубоко пенсионного возраста. Как вы понимаете, в Англии они ни дня не работали... Тем не менее сегодня оба получают пенсию 75 фунтов в неделю. За квартиру, в которой они живут, платит государство. Это 700 фунтов, между прочим! Из своего кармана они платят только за свет, газ и воду! Даже бассейн плавательный для них бесплатно! Я уж не говорю о медицинском обслуживании, лекарствах, общественном транспорте! Честно говоря, меня это даже возмущает! Я должна платить за услуги дантиста, а они, ни дня не проработав в Англии, — нет! В нашей стране так: чем ты беднее, тем больше бесплатных услуг предоставляет тебе государство. Я лично не сторонница такой позиции. Но что делать?!

— Честное слово, коммунизм какой-то! — говорю я. — Мы строили, строили, а у вас тут он уже давно построен.

— Вероятно, государство считает, что лучше платить даже тунеядцам, чем плодить недовольных, — сделала вывод Линда и выразительно посмотрела на часы. — Наши политики очень хорошо усвоили уроки Октябрьской революции в России... Кстати, посмотрите в окно...

На площадке перед отелем стоял автобус, из которого буквально выползали дедушки и бабушки, возраст которых на вид ну явно перевалил за 80.

— Они приехали праздновать День Святого Валентина, — засмеялась Линда. — Вы не представляете, как сегодня будут веселиться эти милые старички, вспоминая с женами или подружками молодость!

— Что, танцы-шманцы до утра, — тупо пошутил я.

— Да, да, и танцы, и шманцы! — рассмеялась Линда. — Кстати, я тоже сегодня приглашена на тусовку... Не хотите со мной? Будет весело, поверьте!

— Увы, у меня поезд, — “отмазался” я от неожиданного экстравагантного предложения. — Но, если Вы позволите, я вам как-нибудь еще позвоню?

— Звоните, — улыбнулась Линда. — Может, и тема для беседы будет повеселее.

Жестом она подозвала официанта и дала ему свою кредитную карточку. Я попытался протестовать...

— Вы — гость, — безапелляционно сказала она и протянула руку. — До следующей встречи.

Линда упорхнула. А я, заказав третью порцию виски, смотрел ей вслед и думал о наших белорусских старичках, о том, что может себе позволить белорусская учительница, выйдя на пенсию. И мне стало совсем грустно...

Евгений СУЛЫГА,
собственный корреспондент
“Народной воли”
в Великобритании.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Новая роля

У судзе Маскоўскага раёна Мінска пачаліся слуханні па справе аб аднаўленні на працы Паўла Харланчука, акцёра Рускага тэатра. Чарговае пасяджэнне адбудзецца 17 сакавіка.

Афіцыйная фармулёўка звальнення — “у сувязі з неадпаведнасцю П.Харланчука займаемай пасадзе акцёра вышэйшай катэгорыі”. Але і сам Павел, і праваабаронцы лічаць сапраўднай прычынай палітычныя матывы, паколькі акцёр быў затрыманы разам з астатнімі ўдзельнікамі намётавага мястэчка ў ноч з 23 на 24 сакавіка 2006 года і арыштаваны на 10 сутак. Палітычныя прычыны звальнення пацвярджаюць і дакументы. Напрыклад, у атэстацыйнай характарыстыцы, якую напісаў мастацкі кіраўнік тэатра Б.Луцэнка, адзначана: “У сакавіку 2006 года Харланчук прыняў удзел у акцыі, скіраванай супраць дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь. За свае дзеянні П.Харланчук быў прыцягнуты праваахоўнымі органамі да адміністрацыйнай адказнасці. Харланчук П. парушыў маральныя падмуркі тэатра і не прызнаў зробленую ім памылку”. На падставе гэтага дакумента акцёр не быў атэставаны і аказаўся без працы.

“Павел самы таленавіты акцёр нашага тэатра, які цалкам адпавядае высокаму званню артыста. Роўнай яму замены няма”, — сказаў падчас адказаў на пытанні суддзі пастаноўчык тэатра Аляксандр Ткачонак.

Марыя САВУШКІНА.

Усіх лідэраў — на жывадзёрку!

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Дарогу маладым!

Як мне падалося, галоўны тэзіс, якога сп.Ляўковіч няўхільна прытрымліваўся на з’ездзе, быў пераняты ім у таварыша Сталіна, які лічыў, што *“кадры вырашаюць усё”*. Праўда, выконваючы абавязкі старшыні “Грамады” ў дакладзе сфармуляваў кіруючую ідэю *“правадыра”* крыху інакш. “Задачу кадраў патрэбна вырашаць неадкладна!” — заявіў ён і распавёў пра “нецывілізаваныя паводзіны намеснікаў старшыні”, іх дэмаршы, сваркі, канфлікты, чорны піяр і г.д. Загадзя падрыхтаваныя дэлегаты з рэгіёнаў замацавалі крытычныя ацэнкі на адрас кадраў, якія ўносяць “раздрай” у партыю.

Тым не менш сваіх апанентаў сп.Ляўковіч перамог перш за ўсё на ўзроўні апаратных гульняў (чамусьці зноў узгадваецца Іосіф Вісарыёнавіч). Анатоль Іосіфавіч здолеў схіліць на свой бок “абласнікоў” (кіраўнікоў абласных партарганізацый). Тыя, відаць, патлумачылі дэлегатам ад сваіх рэгіёнаў, як “правільна” галасаваць. Астатняе было справай тэхнікі. І агітацыі (у кулуарах з’езда пра гэта хадзілі ўпартыя чуткі) з дапамогай не толькі маральных, але і матэрыяльных аргументаў.

Справядлівасць, аднак, усё ж патрабуе дадаць, што найбольш удалая і канструктыўная фармулёўка ідэі кадравага аздараўлення “Грамады” належыць не Ляўковічу, а аднаму з тых, каго ён з дапамогай з’езда “чысціў”. Я маю на ўвазе былога намесніка старшыні партыі Віталя Малашку. “Паглядзіце на склад кіраўніцтва. У прэзідыуме Лойка, Кароль, Трусаў, Ляўковіч, Грыб, Нісцюк, Сідарэвіч — людзі пенсіённага ўзросту (хоць не ўсе яны пенсіённага. — **Рэд.**), ужо не здольныя на свежыя ідэі і ўчынкі... Няма кураж! Толькі сыплецца пясок і шапялявыя ўздыхі. Лічу, што ў кіраўніцтва партыі неабходна абраць людзей не старэй 45 год...” З трыбуны з’езда заклік да амаладжэння кіраўніцтва партыі падтрымаў толькі Алег Трусаў...

У артыкуле “Крызіс састарэлага ўзросту”, падрыхтаваным да з’езда, сп.Малашка закрануў яшчэ адну праблему, якая сёння трывожыць многіх партыйцаў у сувязі з удзелам “Грамады” ў “Саюзе левых партый”. Закрануў востра і свядома правакацыйна. *“Сёння партыя ідзе ў другі бок. Мы прадаем партыю Калякіну, за якім стаяць маскоўскія грошы... Маскалям патрэбна прарасійская апазіцыя ў Беларусі... Ляўковіч канкрэтна заявіў на апошнім ЦК, што мы пераарыентаваліся на Расію. Прабачце, але гэта ўжо зусім іншая партыя!”*

Пра гандаль партыяй распавёў і госць з’езда — былы міністр замежных спраў краіны Пётр Краўчанка. Ён узгадаў, як некалькі год таму адзін з лідэраў “Грамады” прапанаваў яму за тры тысячы долараў, як кажуць, прыняць гаспадарку. Пакуль Пётр Кузьміч шукаў грошы, яго абышоў больш багаты спонсар.

А як адрэагаваў на інфармацыю аб гандлі партыяй з’езд? Зрабіў выгляд, што няма праблемы. Як і ў выпадку, калі Уладзімір Нісцюк напрасткі абвінаваціў Анатоля Ляўковіча ў тым, што той (як бы мягчэй сказаць) паклаў у кішэню дзесяткі тысяч партыйных долараў. Калі сп.Нісцюк скончыў сваю заяву, нехта з дэлегатаў напаўголаса (з яўнай іроніяй) працытаваў словы Глеба Жыглова з папулярнага савецкага тэлесерыяла: “Злодзей павінен сядзець у турме”.

І на гэтай цытаце справа супынілася. Дэлегаты абцёрліся, нехта мармытаў аб тым, што нельга выносіць смецце з хаты, нехта гаварыў пра адсутнасць доказаў. Але нікому нават і ў галаву не прыйшло паставіць пытанне рубам: стварыць камісію, правесці расследаванне і, калі гэта праўда, то адсекчы руку злодзею, калі хлусіць абвінаваўца, вырваць яму язык. А той, на каго перакулілі тазік з брудам, толькі недарэчна ўсміхаўся і гаварыў пра зусім іншыя рэчы. Чалавечы гонар, пачуццё годнасці, сумленне быццам бы і не стаялі побач...

***

Усё ж ёсць падставы лічыць сп.Ляўковіча і яго палечнікаў пераможцамі на з’ездзе. У кіруючыя органы партыі ў асноўным патрапілі людзі, якіх ён хацеў бачыць у складзе кіраўніцтва. Першым намеснікам старшыні стаў сам Анатоль Іосіфавіч. У намеснікі абралі Івана Анташкевіча, Ігара Рынкевіча, Анатоля Сідарэвіча, Валерыя Фралова. Выканаўчае бюро партыі з’езд скасаваў, пакінуўшы ў якасці выканаўчага органа прэзідыум, які сп.Ляўковіч спадзяецца трымаць пад сваім кантролем. Парадак, які зараз усталёўваецца ў “Грамадзе”, ужо называюць кантралюемай дэмакратыяй. Бліжэйшы час пакажа, што з гэтага атрымаецца.

АЗБУКА ПОЛИТОЛОГИИ

Стимулы для белорусской бюрократии

Проблема мотивации государственных чиновников — одна из фундаментальных для любой экономической системы. Актуальна она и в Беларуси. Создать новые эффективные стимулы не так-то просто, над этим бились еще лучшие умы прошлого. Поэтому неслучайно прижилось в современном языке слово “стимул”, означающее в переводе с латинского длинную заостренную палку, которой погоняют ослов.

Кто контролирует контролера?

В политологии есть такое понятие, как “ресурсное проклятие”. Казалось бы, уж насколько богата Саудовская Аравия, а сводит бюджет с дефицитом. Все дело в том, что жить с прибыли и жить с природной ренты — это, как говорят в Одессе, две большие разницы. Прибыль — она от мозгов, которыми необходимо энергично шевелить, иначе конкуренты съедят. Причем шевелить приходится не только бизнесменам, но и государственным чиновникам. Задача вторых — создавать условия для работы первых. Бизнесмены — существа капризные: чуть что не так, они прекращают инвестировать деньги в долгосрочные проекты, а то и вовсе норовят перевести свои капиталы за рубеж. Ищи потом ветра в поле.

С рентой проще. Организовать ее поступление способен любой африканский сержант, была бы власть да был бы подходящий природный ресурс. Современность полна подобных примеров. На их фоне уникальность Беларуси выглядит особенно впечатляюще. Синеокая умудрилась извлекать ренту не из собственных, а из чужих природных ресурсов.

Но за все в этой жизни приходится платить. Невозможно жить с ренты и при этом оставаться белым и пушистым, пусть даже в кармане у тебя два диплома о высшем образовании. К примеру, один — историка, второй — экономиста. Рента коварна. Однажды возникнув, она порождает цепочку неизбежных и в целом весьма печальных последствий. Процитируем российского экономиста Константина Сонина: *“Если в стране много природных ресурсов, то для руководства этой страны не так важно создавать стимулы для бюрократов и, соответственно, средства массовой информации, которые могли бы помогать обеспечивать эти стимулы”.*

Природа бюрократов не зависит ни от истории, ни от экономики. Бюрократ — исполнитель. Если его перестать контролировать, то он немедленно сбрасывает обороты, и это в лучшем случае. В худшем же начинает использовать служебное положение для личного обогащения. Такое поведение принято называть рентоориентированным. К наличию или отсутствию природных ресурсов оно не имеет никакого отношения, ибо в данном случае бюрократ извлекает ренту из своей монопольной роли в процессе принятия решений.

Отсюда вытекает необходимость контроля. В демократических странах основным контролером являются независимые от государства СМИ. В недемократических — специализированные государственные структуры. Как правило, они многочисленны, что не удивительно: контролеры — это те же бюрократы. Они сами нуждаются в контролерах. Далеко не факт, что добытая ими информация будет передана непосредственному заказчику. Всегда существует соблазн “вручить” ее объекту наблюдения. Разумеется, не безвозмездно.

Точка равновесия

Когда говорят, что в некой авторитарной стране достигнута социальная стабильность, это не в последнюю очередь означает наличие определенного компромисса между контролерами и контролируемыми внутри бюрократической пирамиды. Не будьте наивными и не думайте, что чиновники (в первую очередь высшие) начинают жить на одну зарплату. Компромисс — это четкое осознание участниками процесса границ допустимого.

Достигнутый компромисс не исключает отдельных “громких” дел. Во-первых, таким образом “щука” напоминает “карасям” о своей дееспособности, а во-вторых, инициаторами часто выступают сами “караси”. Ничего необычного в этом нет. Главными конкурентами любого “карася” в борьбе за место у кормушки являются другие “караси”. Вот и приходится периодически оттеснять соперников накопленным в процессе служебного рвения компроматом.

Положение точки равновесия в установившемся “единстве и борьбе противоположностей” зависит от количества ресурсов внутри бюрократической пирамиды. Тратить львиную долю на себя современные бюрократы уже не могут. Мы живем в эпоху социальных государств, и с этим приходится считаться. Отдельные исключения в виде Северной Кореи лишь подтверждают правило. Там, в стране “Отца и Сына”, гибель сотен тысяч соотечественников от голода — не повод для корректировки политического курса. Полагаю, что это даже не повод для отставки тамошнего премьер-министра.

Диктаторам же в остальных странах, независимо от их географического положения, приходится уделять серьезное внимание экономическому росту. Хорошо, когда ежегодный прирост ВВП измеряется двузначными числами. Но подобные темпы не обязательны. И при 4% диктаторы могут особо не беспокоиться за свою судьбу и судьбу своих детей.

«Дилемма Горбачева»

К Михаилу Сергеевичу еще в бытность его генеральным секретарем современники приклеили ярлык “нерешительный политик”. Горбачев столкнулся с дилеммой, которая не имела решения. В 1986 г. обвалились цены на нефть. Номенклатура осталась без привычных ресурсов, и внутри нее стало расти напряжение. Отработанные методы контроля потеряли свою эффективность. СССР нуждался в срочном реформировании, начинать которое без соответствующего стимулирования бюрократов было невозможно. Требовался “внешний” источник контроля в виде независимых СМИ, но перенос функции контроля на прессу вел к подрыву “основ режима”. Инициатор перестройки если и не понимал, то, по крайней мере, чувствовал наличие дилеммы, отсюда и нерешительность.

В чем-то сходная проблема встала сегодня и перед Александром Лукашенко. Этап “энергетические ресурсы в обмен на поцелуи” в белорусско-российских отношениях, судя по всему, подходит к концу. Беларусь на пороге кризиса, а кризис — это стадия в развитии системы, когда система оказывается не адекватной изменившимся внешним вызовам.

Сегодня Беларусь остро нуждается в инновационных политических решениях, но такие решения просто некому вырабатывать. Благодаря целенаправленным многолетним усилиям “всенародноизбранного” в стране отсутствует политика, под которой следует понимать сферу самостоятельных действий по выбору целей, конкуренцию программ и лидеров.

Но в силу личных причин “дилемма Горбачева” для Лукашенко исключена. В далеком прошлом остались времена, когда он с гордостью заявлял, что первым в Беларуси организовывал фермерские хозяйства, создавал коммерческие банки и еще много чего инициировал первым. Рыба, как известно, гниет с головы, но чистят ее с хвоста. Так вот, судя по заявлениям, сделанным 3 января в ходе совещания по вопросам обеспечения страны энергоресурсами, белорусскому государственному хвосту в ближайшем будущем не позавидуешь.

Приведу наиболее яркое высказывание Лукашенко: *“Поэтому, Сергей Сергеевич (Сидорский), — мы с вами вчера уже разговаривали, я вам сказал: ”Принимайте любые решения и считайте, что это мои решения..." Кто-то станет поперек — я специально Зенона Ломатя (председателя Комитета госконтроля) пригласил, проинформируйте Генерального прокурора. Немедленно примите самые жесткие меры — говорю это публично перед народом".*

Усиление контроля — это все, что есть в управленческом арсенале главы белорусского государства. Негусто! За 12 с лишним лет работы на одной и той же должности “кроме мордобития — никаких чудес”. Вот наш ответ на вызовы постиндустриального общества! Интересно, если бы Лукашенко обратился в одно из кадровых агентств Минска и прошел там тестирование, то на какую должность он смог бы после этого рассчитывать?

Еще раз о «карасях»

Чего следует ожидать в среднесрочной перспективе? Мой прогноз следующий: по мере сокращения дотаций со стороны России внутри президентской “вертикали” будет нарастать напряжение. Массовая профнепригодность представителей белорусской элиты (неспособность быть адекватными в сколько-нибудь сложной ситуации) станет дополнительным фактором, усугубляющим кризис.

Реакцию же Лукашенко предсказать несложно: он продолжит закручивать гайки. Самый главный шаг в этом направлении уже сделан. Я имею в виду указ, согласно которому **Виктор Лукашенко** введен в состав Совета безопасности. Щука, как известно, существует в пруду для того, чтобы караси не дремали. Но в данном случае речь идет о качественно иной проблеме: политические “караси”, в отличие от своих прудовых собратьев, при определенных внешних условиях способны собираться в стаи и формулировать собственные цели.

Не исключено, что процесс уже пошел. Его развитие и станет стержнем подковерной политики в среднесрочной перспективе. К сожалению, иной политики в Беларуси просто нет, по крайней мере, сегодня.

Сергей НИКОЛЮК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 САКАВІКА 2007 г.

Як справы, фермер?

Нататкі з 10-га з'езда фермераў Беларусі

"Без селяніна няма дзяржавы. Без гаспадара на зямлі — будучыні". Такім плакатам сустракала дэлегатаў зала, у якой праходзіў з'езд фермераў Беларусі.

Аддача гектара

Гэта тэма раскрывалася на стэндах, выстаўленых у офісе. На адным з іх расказвалася пра набыткі фермерскай гаспадаркі Міхаіла Шруба з Жыткавіцкага раёна. Маючы толькі 3,6 працэнта сельгасугоддзяў раёна, яго гаспадарка дае 10,2 працэнта малака, 8,5 працэнта мяса і 63,9 працэнта агародніны. Тут самая высокая ўраджайнасць збожжавых — у 1,5 раза вышэй, чым у сельскагаспадарчых арганізацыях, бульбы — у 2,2 раза, агародніны — у 5,5 раза. Са 100 гектараў сельгасугоддзяў атрымана прыбытку 64,2 мільёна рублёў, а ў сярэднім па раёне — 7 мільёнаў.

У цэлым гомельскія фермеры папрацавалі так. Удзельная вага іх зямель сярод сельгасарганізацый вобласці складае 1,12 працэнта. А вырашчана бульбы 13 працэнтаў, агародніны — 17,2 працэнта, збожжа — 1,2 працэнта. Ураджайнасць "збожжавых" фермераў Жыткавіцкага раёна склала летась 43,2 цэнтнера з гектара. Рэкордных ураджаяў агародніны дабіліся фермеры Жыткавіцкага раёна — 466 цэнтнераў з гектара, Петрыкаўскага — 400 цэнтнераў з гектара. Па ўраджаю бульбы і гародніны фермерскія гаспадаркі абышлі іншыя сельскагаспадарчыя арганізацыі вобласці і перавысілі іх паказчыкі на 52 і 53 цэнтнеры з гектара.

Дакладчык, старшыня праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання фермераў **Канстанцін ЯРМОЛЕНКА** прывёў такія даныя. Фермерскія гаспадаркі краіны займаюць толькі 1,3 працэнта зямлі, а даюць 13 працэнтаў бульбы, каля 30 працэнтаў агародніны.

Выступоўцы падкрэслівалі, што фермерства паказвае нават у нашых неспрыяльных умовах высокую эфектыўнасць гаспадарання. І задавалі пытанне: "Чаму ж фермеры не сталі лакаматывам развіцця сельскай гаспадаркі краіны?"

Адносіны? Як да «незаконнанароджаных»

І сапраўды, чаму? Тым больш што ў апошнія гады ў краіне як быццам і нямала зроблена па развіцці гэтай формы гаспадарання. Ёсць Закон аб фермерскіх гаспадарках, указы прэзідэнта. Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання сумесна з аблвыканкамамі распрацавалі мерапрыемствы па развіцці фермерскіх гаспадарак, якімі прадугледжаны выдзяленне прыдатных земляў, перадача невыкарыстоўваемых памяшканняў, атрыманне па льготных цэнах угнаенняў і г.д.

Аднак колькасць фермераў не павялічваецца, а змяншаецца. Раней іх было каля 5 тысяч, а стала крыху больш за 2 тысячы. Чаму? Выступоўцы шукалі адказы на пытанне. Адны гаварылі аб тым, што на калгасны гектар укладанні складаюць прыкладна 150 долараў, а на фермерскі — можна сказаць, нуль. У цэлым на падтрымку фермерства выдзяляюцца мізэрныя сродкі. У 2004 годзе было выдзелена толькі 670 мільёнаў рублёў, ці прыкладна па 300 тысяч рублёў на фермера. Што за такія сродкі можна набыць? У 2005 годзе было выдзелена на гэтыя мэты 808 мільёнаў рублёў, летась — у два разы больш. Але гэта ўсё роўна кропля. У той жа час для малаэфектыўных сельскагаспадарчых арганізацый выдзяляюцца трыльёны рублёў. На фермераў усё яшчэ глядзяць так: яны як быццам і не чужыя, але "незаконнанароджаныя".

Знакаміты фермер з Брэстчыны **Канстанцін ВАРАБЕЙ** расказаў, што ў яго рэгіёне 52 фермеры спынілі сваю дзейнасць. І з-за чаго? З-за кепскай зямлі, выдзеленай ім у карыстанне. Яе апрацоўка запатрабавала шмат сродкаў. Каму ж удаецца атрымаць прыдатныя ўчасткі, дык за іх прыходзіцца шмат плаціць. Маўляў, гаспадарка сюды ўнесла ўгнаенні, дык заплаці за іх. З-за гэтага ўчастка тая ж гаспадарка не збярэ пэўны ўраджай — зноў даплачвай ёй фермер.

Расказваючы пра падобнае, некаторыя гаварылі аб тым, што ў краіне не выконваецца заканадаўства па фермерству, што трэба сустрэцца з прэзідэнтам і адкрыць яму вочы. Бо паралельна шмат сродкаў закопваецца ў зямлю, у тым ліку і пры будаўніцтве аграгарадкоў. На думку некаторых, яны — штучныя ўтварэнні, нібы тыя "рэзервацыі для індзейцаў". Селянін заўжды быў прывязаны да зямлі, а не да асфальту. Адзін выступоўца расказаў анекдот, які, думаецца, тут будзе дарэчы. Сядзіць новы селянін у крэсле і коле дровы. Яму кажуць, што так нязручна. А ён у адказ: "Я спрабаваў лежачы, атрымоўваецца яшчэ горш".

"Мы не хочам ільгот, мы хочам роўных умоў з усімі гаспадарнікамі на зямлі", — гаварыў дакладчык, выказваючы думку большасці ўдзельнікаў з'езда. На паперы ўсё гэта абвешчана, а вось у жыцці... З трыбуны прагучаў такі факт. Чалавек мае вялікую сям'ю, пяць дзетак. Хоча стаць фермерам. Ды не можа. Не мае першапачатковага капіталу. Трэба ж набыць зямлю, тэхніку, насенне... Хто яму дапаможа? Ды ніхто. Быў бы ён украінцам, дык адразу атрымаў бы падтрымку ў памеры 20 тысяч долараў ад дзяржавы. Менавіта так ставяцца да фермерства нашы суседзі.

Жонка фермера

Тым не менш, нягледзячы на цяжкасці, фермерства ў Беларусі існуе. Пры грамадскім аб'яднанні фермераў створана юрыдычная служба, якая аказвае паслугі гаспадарам зямлі. Сотня з іх ужо мае электронныя пошты, некаторыя займелі свае сайты. Вядзецца пэўная работа з жонкамі і дзецьмі фермераў.

Жонка фермера — не толькі хатняя гаспадыня, але і яго паплечнік у працы, бо гэта часта сямейны бізнес. Значыць, і ёй даводзіцца вучыцца. Было наладжана іх навучанне на камп'ютэрах, арганізавана паездка за вопытам у Санкт-Пецярбург. Шматабяцальная праца з дзецьмі фермераў. Карысныя іх сустрэчы, на якіх моладзь дзеліцца вопытам працы на ферме, марамі аб будучым. Мацуюцца сувязі з фермерамі Літвы, Расіі, Украіны. Усё гэта робіцца, каб замацаваць тыя набыткі, якія яшчэ ёсць.

Свае меркаванні і прапановы па развіцці фермерства ў краіне дэлегаты выклалі ў звароце да ўрада.

Валтузня вакол «верхніх эшалонаў»

Нельга не сказаць, што на з'ездзе была спроба ўцягнуць фермераў у абмеркаванне праблем, далекаватых ад іх жыцця. Быў распаўсюджаны допіс без подпісу "Аб стварэнні адзінай рэспубліканскай асацыяцыі фермерскіх гаспадарак". У ім сцвярджалася, што адной з галоўных прычын слабага развіцця фермерства ў краіне з'яўляецца менавіта адсутнасць адзінай рэспубліканскай арганізацыі фермераў і ў выніку адарванасць фермерскіх гаспадарак і іх арганізацый як ад "верхніх эшалонаў кіраўніцтва — Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, так і ад ніжэйшых — раённых". Група ўдзельнікаў з'езда, сярод якіх была і старшыня савета Беларускага грамадскага аб'яднання фермераў **Тамара БАРЭЙША**, настойліва хіліла аўдыторыю да абмеркавання такога пытання ды крытыкавала старшыню праўлення аб'яднання Канстанціна Ярмоленку. Яны сцвярджалі, што міністэрства будзе прыслухоўвацца толькі да моцнай арганізацыі і што нібыта ў міністэрстве казалі, што з гэтай арганізацыяй ніякіх спраў мець не будуць. Іхнія довады і фармулёўкі схіляюць да думкі: ці не хавалася за гэтым задумка змяніць кіраўніцтва грамадскай арганізацыі фермераў. .

Большасць дэлегатаў з'езда фермераў не паддаліся на ўгаворы. Яны даводзілі сваім апанентам, што грамадская арганізацыя фермераў — структура добраахвотная і ніякімі заклікамі сагнаць сюды іх не атрымаецца. Фермеры пойдуць у грамадскую арганізацыю толькі тады, калі адчуюць ад яе карысць. Да таго ж стварацца яшчэ адзін "Мінсельхарч" не варта.

Хто такі Варабей?

На з'ездзе было абрана кіраўніцтва грамадскай арганізацыі. Старшынёй праўлення зноў выбраны Канстанцін Ярмоленка. Цяпер у арганізацыі новы старшыня Савета. Ім стаў вядомы фермер з Брэстчыны Канстанцін Варабей.

Цікавы яго лёс. Будучы вучнем, выступаў у абласных і рэспубліканскіх конкурсах мастацкай самадзейнасці. У 1967 годзе, пасля заканчэння сярэдняй школы, яму як пераможцу конкурсу юных талентаў прапанавалі без экзаменаў паступіць у музычнае вучылішча. Але ён прыслухаўся да парады бацькі, калгаснага пчаляра, і паступіў у сельскагаспадарчую акадэмію. Пасля яе заканчэння працаваў аграномам у Пружанскім раёне, затым у раённым упраўленні сельскай гаспадаркі, быў дырэктарам саўгаса "Мухавец". У 1991 годзе стварыў і ўзначаліў фірму "Аграбугсервіс". У 2001 годзе стварыў фермерскую гаспадарку "Агра-Буг". Так што ў яго ёсць і веды, і вопыт, каб "быць карысным для калег", як ён і сказаў.

Алесь ДРАБЧУК.

КОРОТКО

На юг

Два автобуса марки МАЗ отправились недавно в Азербайджан — для работы в городе Баку их закупил государственный концерн "Азербайджанские авиалинии".

В еще одном южном государстве, Казахстане, белорусские автомобили уже стали привычным явлением. Поставки продукции Минского автозавода в эту страну осуществляются с 2002 года. И если в 2005 году в Казахстан было отправлено 939 единиц белорусской автотехники, то в году наступившем работать "на целине" начнут около 1700 МАЗов, сообщает агентство "Минск-новости".

Трактор нового поколения

В 2007 году Минский тракторный завод (МТЗ) планирует создать совместное предприятие с Кишиневским тракторным заводом "Траком". Об этом БелаПАН сообщил первый заместитель маркетинг-директора РУП "МТЗ" Игорь Волковец. Подписано соглашение о проведении конструкторских и производственных работ по созданию опытного образца модернизированного трактора. *"Это будет трактор нового поколения с новой кабиной и подвесками"*, — отметил специалист.

Догоним Польшу?

В Беларуси разработана новая концепция энергобезопасности, сообщил первый заместитель премьер-министра Беларуси Владимир Семашко на коллегии Департамента по энергоэффективности Госстандарта.

Он отметил, что суть концепции — в адаптировании экономики к мировым ценам на энергоресурсы, наведении "порядка в большой энергетике", повышении "эффективности работы станций".

Как отмечалось на коллегии, уровень потребления топлива в Беларуси составляет 410 кг в нефтяном эквиваленте на 1 тысячу долларов ВВП, тогда как в Польше этот показатель 210 кг, а в ряде стран Евросоюза еще ниже — 140—150 кг. В Беларуси ставится задача к 2010 году достичь уровня 280—290 кг на 1 тысячу долларов ВВП.

Стоит заметить, что ранее в Польше были такие же показатели как и в Беларуси. Но там не дремали прошедшее десятилетие, а занимались совершенствованием технологий. Так что никакая это не новая концепция, а просто поворот к опыту соседей.

ОНИ — О НАС

Скоро может появиться огромная дыра

Нелегкие времена настали для президента Беларуси Александра Лукашенко. Экономика страны, похоже, начала разваливаться. И виной тому новогодний нефтегазовый конфликт с Россией. Из-за повышения цен на нефть и газ в бюджете республики скоро может появиться огромная дыра. А денег взять неоткуда. Вот и пришлось официально попросить у России в долг полтора миллиарда долларов.

Напомним, что ранее белорусские власти неоднократно заявляли, что повышение цен на российские газ и нефть на экономику Беларуси никак не повлияет. Но, судя по всему, ситуация стала выходить из-под контроля. Потери белорусского бюджета от повышения цен на российские энергоносители оцениваются примерно в 600 млн долларов (экономика страны в целом потеряет 3,5 млрд долларов). Но Минск просит полтора миллиарда, и именно в бюджет. Значит, дела в казне еще хуже, чем можно было предположить.

В российском правительстве реагировать не спешат. Глава Минэкономразвития Герман Греф лишь обмолвился, что возможность предоставления кредита обсуждается. Деньги у России, конечно, есть, но заем без процентов — это прямые потери не менее 100 млн долларов в год.

Просто лояльность Батьки нам уже не нужна. Понимая это, белорусы вспомнили о материальном. Министерство экономики Беларуси распространило специальный план мероприятий по стабилизации ситуации на внутреннем валютном рынке и достижению положительного сальдо внешней торговли страны в 2007 году. В нем белорусы попытались "подписаться" под тем, что в скором времени в стране начнется полномасштабная приватизация в ключевых отраслях, а доля иностранных источников в общем объеме инвестиций в основной капитал будет увеличена до 10%.

Правда, вряд ли таким сладким обещаниям можно безоговорочно верить. Лукашенко, как известно, с трудом расстается со своими ценностями. Однако, с другой стороны, у него в сложившихся обстоятельствах не остается выбора. Его заигрывания с Западом никого там не впечатлили, а восстановить доверительные отношения с Москвой после новогодних скандалов непросто.

Самым масштабным проектом в белорусской приватизации для России скорее всего окажется завершение сделки по покупке "Газпромом" 12,5% акций "Белтрансгаза" за 625 млн долларов, о чем 31 декабря 2006 года договорились Москва и Минск. Кроме того, в скором времени будет завершена продажа государственных долей в Славнефтебанке (седьмой по размеру активов банк Беларуси) и Белвнешэкономбанке (шестое место по размеру активов) российским ВТБ и Внешэкономбанку соответственно за 32 млн долларов и 16 млн долларов. Впрочем, об этих сделках известно уже давно. А среди новых предприятий могут оказаться крупные нефтеперерабатывающие и химические предприятия, в том числе НПЗ "Нафтан", Мозырский НПЗ, ОАО "Полимир", "Белшина", "Гродно Азот", могилевское и гродненское "Химволокно", а также Минский автомобильный завод, "Белтелеком" и многие другие.

Фрагменты из статьи Евгении НИКОЛАЕВОЙ.
izvestia.ru

Что по этому поводу думают в Беларуси?

Заместитель министра промышленности Беларуси Валентин Гуринович сообщил, что пока акционировать МАЗ не планируется. "Если бы предприятием заинтересовался частный инвестор и это дало бы толчок к приватизации, то тогда однозначно нужно проводить приватизацию", — цитирует его "Интерфакс".

Премьер-министр Сергей Сидорский заявил: "Если кто-то хочет купить белорусские предприятия за копейки — этого не будет. Они должны стоить столько, сколько они стоят в рыночной экономике". При этом он добавил, что в настоящее время рассматривается возможность продажи инвесторам акций ОАО "Белшина". По оценкам главы белорусского правительства, "это эффективно работающее предприятие" будет стоить более 1 млрд долларов.

По его мнению, ничего экстраординарного не происходит: "правительство Беларуси каждый год составляет программу приватизации, разгосударствления отечественных предприятий". По крупным предприятиям уже проведена эта работа. "В любой момент, если инвесторы изъявят желание работать с белорусскими предприятиями, на тех условиях, которые определил президент, мы готовы сотрудничать", цитируют его "Белорусские новости" и напоминают, что в качестве одного из способов спасения страны от финансового кризиса Минэкономики Беларуси разработало "План мероприятий по стабилизации ситуации на внутреннем валютном рынке и достижению положительного сальдо внешней торговли в 2007 году". По этому плану предстоит масштабная распродажа государственной собственности, в том числе в ключевых отраслях экономики. На продажу, в частности, предлагается выставить акции таких акционерных обществ, как НПЗ "Нафтан", Мозырский НПЗ, "Полимир", "Белшина", "Гродно Азот", "Могилевхимволокно" и "Гроднохимволокно". Также предполагается приватизация крупнейших унитарных предприятий: МАЗа, "Белтелекома" и других предприятий.

Стало быть, проблемы с финансами в стране есть. И большие.

Евгений ТАВГЕНЬ.

ЧИТАТЕЛЬ СОВЕТУЕТ

Дует ветер, а сколько при этом пропадает энергии!

Не могу не принять участия в обсуждении проблем энергетики, поскольку я этими вопросами давно интересуюсь. Собирал информацию о нетрадиционных видах энергии, благо в те времена такую информацию можно было найти в многочисленных журналах и газетных публикациях.

Так, в поле моего зрения попадали сообщения об энергии равнинных ГЭС, разработки белорусского изобретателя в области ветроэнергетики, где энергия извлекалась из потока воздуха, который создавался в вертикальной трубе, наверху которой были установлены лопасти. Вверху трубы создавалась разница температур и давления, поэтому здесь даже не надо было сильного ветра.

Наконец, попадались даже документальные подтверждения использования энергии ветра. В одном из номеров газеты "Звязда" был помещен снимок ветроустановки на частном доме в г.Барановичи и сообщалось, что хозяин сделал ее самостоятельно и обеспечил свой дом электроэнергией. Подобную информацию опубликовала газета "Известия" об умельце из России, также кустарно изготовившем ветряк, который крутил генератор. Видел в одном из журналов промышленный образец ветроустановки, которая предназначалась для подачи воды на приусадебных участках из водоемов.

Наблюдая за погодой в нашей стране пришел к убеждению, что имеющейся энергии ветра вполне достаточно, если и не для его промышленного использования, то для нужд частного жилого сектора, которого в республике весьма много. Вот недавно, в конце января, у нас дули сильные ветры. Это сколько энергии пропадало зря, представляю, сколько ее смог бы я получить, если бы дома стоял ветряк с генератором. Ее бы хватило и на обогрев дома, и для питания электроприборов, возможно, лишнюю ее часть отдал бы в городскую энергосеть. А если бы часть крыши была покрыта солнечными панелями и использована биоэнергия от пищевых отходов, сорняков, листьев и веток с деревьев, опилок с приусадебного участка? Сколько было бы сэкономлено газа, нефти, угля в масштабах республики, если бы значительная часть частного жилого сектора могла бы использовать такие автономные системы энергоснабжения!

Следует продумать и вариант для промышленного использования названных видов энергии. Почему-то постоянно закрывают дискуссии на эту тему выражением, что силы ветра на территории республики для ее промышленного использования недостаточно, мест, где силы ветра хватает, чтобы крутить генераторы с достаточным КПД, очень мало. Ладно, допустим, что это так. Тогда продумаем следующий вариант. Размещаем ветроустановку в сельскохозяйственном предприятии, на крышах помещений размещаем солнечные панели, а навоз и достаточное количество сорняков, опилок, веток и тому подобное используем в установках для получения биогаза. Получаем достаточно мощный энергетический комплекс, энергии которого было бы с избытком для хозяйства и можно было бы ее реализовать в иных целях. А если такое предприятие находится недалеко от реки, то можно было бы построить и мини-ГЭС.

В любом случае предлагаемое — альтернатива принятому решению о строительстве в стране атомной электростанции. Дело только в том, что здесь необходима серьезная работа ученых, конструкторов, технологов, и прежде всего интерес к проблеме, тем более что поиск альтернативных видов энергии в настоящее время — это уже вопрос выживания даже не отдельно взятой страны, а всего человечества.

Владимир ВЕРШИЛО, житель г.Кобрина.

Чэкавы падман

Добры дзень, "Народная воля"!

Хачу расказаць, як я стаў акцыянерам і што з гэтага атрымалася.

Па беларускіх тэлеканалах і ў іншых дзяржаўных СМІ неаднойчы гучалі заявы высокіх чыноўнікаў, што яны ў нашай краіне не пайшлі шляхам "дзікай" прыватызацыі, як гэта адбылося ў Расіі, што яны распрацавалі іншых шлях, беларускі, каб сацыяльна абараніць насельніцтва. А што адбываецца на самай справе? У Расіі кожнаму грамадзяніну выдалі па ваўчару, у Беларусі — сертыфікаты імянных прыватызацыйных чэкаў "Маёмасць". Адно і тое. Як паказаў час, сертыфікат з самага пачатку быў пустой паперкай.

Асабіста я сертыфікат атрымаў у жніўні 1994 года. Звяртаю ўвагу, што да гэтага часу Беларусь ужо стала прэзідэнцкай рэспублікай, мы атрымалі гаранта Канстытуцыі, гаранта нашых правоў і свабод. Гэтыя "гарантыі" шмат хто адчуў на сваёй уласнай скуры. У мяне на руках скапілася 262 чэкі — мае і членаў сям'і. Але што рабіць далей з гэтай "паперкай", я не ведаў. Арганізацыі, якія былі пасрэднікамі паміж насельніцтвам і прадпрыемствамі, выканаўчая ўлада ў хуткім часе ліквідавала. Шматлікія фірмы актыўна пачалі скупку чэкаў у насельніцтва, але грошы давалі невялікія.

І весь у 2003 годзе ўлада абвясціла, што тэрмін абарачэння чэкаў заканчваецца, калі не памыляюся, 30 снежня 2003 года. Хто не паспее ўкласці чэкі ў акцыі, улада не вінавата. Трэба было дзейнічаць. Праз філіял №520 "Беларусбанка" я набыў акцыі: "Мінскпраектмэбля" — 25 акцый, "Мінскі домабудаўнічы камбінат" — 50 акцый, "Спецрадыёналадка" — 50 акцый, "Мінскгрузааўтатранс" — 62 акцыі.

Такім чынам, я стаў уладальнікам 187 акцый! У любой цывілізаванай краіне я б на дывідэнды жыў прыпяваючы. Але ж у цывілізаванай краіне. А ў нас? Вы ж памятаеце, як адзін вельмі высокі вертыкальшчык сказаў: "Я свое государство за цивилизованным миром не поведу!"

Замест мёртвых чэкаў я стаў уладальнікам мёртвых акцый. Наступіла цішыня. Ніякай зваротнай сувязі паміж мной, акцыянерам, і прадпрыемствам не існавала. І вось лёд крануўся. У лютым 2006 года я атрымаў грашовы перавод — "Мінскпраектмэбля" мне пералічыла дывідэнды. Вы нават уявіць сабе не можаце, якая там была сума! Больш як за два гады мае 25 акцый (100 чэкаў) зарабілі 720 рублёў (!!), крыху не хапае на тры льготныя паездкі ў тралейбусе. Такую абражальную суму я атрымліваць адмовіўся.

Я не разумею кіраўнікоў ААТ "Мінскпраектмэбля", як ім не сорамна дасылаць такія сумы. Такія грошы сорамна падаваць нават жабракам у падземным пераходзе. А можа, тыя кіраўнікі ўсіх нас лічаць жабракамі? Тады ўсё зразумела. У нашай "сацыяльна накіраванай" дзяржаве, з "абароненым" (кім і ад каго) насельніцтвам — усе жабракі, за выключэннем чынавенства.

Пасля гадавога маўчання зноў адгукнулася "Мінскпраектмэбля". На гэты раз мне настойліва прапануюць падарыць акцыі дзяржаве. Наверсе пытанне ўжо вырашана, дагавор дарэння акцый падрыхтаваны, ад мяне патрабуюць паставіць свой подпіс. За 25 акцый мне абяцаюць кампенсацыю ў 3500 рублёў. За гэтыя грошы на Камароўскім рынку можна набыць 1 кг мандарынаў ці 300 грамаў варанай каўбасы.

Кіраўнікі ААТ "Мінскпраектмэбля" ссылаюцца на рашэнне сходу акцыянераў ад 2.11.2006 г., на які мяне не запрашалі, і на указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.08.2006 г. №538.

Цікава, што за кошт маіх 25 акцый, якія ацэнены ў 3500 рублёў, прадпрыемства плануе мадэрнізаваць вытворчасць, павялічыць яе аб'ёмы, атрымаць дадатковы прыбытак і гэтак далей.

Чаму дзяржава аднімае акцыі ў насельніцтва? Можа, таму, што на самай справе кошт акцый значна вышэйшы? І яшчэ, па тэлеканалах не прыпыняецца прапаганда, што ў Беларусі самы высокі ў СНД рост вытворчасці, што эканоміка самая стабільная і ў той жа час дывідэнды выплаціць няма чым, заробкі нізкія, дапамогі па беспрацоўі і іншыя мізэрныя, пенсіі спрабуюць урэзаць, за газ плаціць няма чым. Штосьці не стыкуецца прапаганда з рэчаіснасцю...

Ілля КОПЫЛ, жыхар Мінска.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 САКАВІКА 2007 г.

ПАЗІЦЫЯ

Вольга ІПАТАВА:

«Мы жывём у стане гвалту над чалавечай душой…»

Паэтку і пісьменніцу Вольгу Іпатаву прадстаўляць не трэба. Яна ўшчыльную займаецца распрацоўкай гістарычнага жанру ў беларускай прозе. Яе можна па праве лічыць пачынальніцай беларускай гістарычнай прозы. Да яе быў толькі непаўторны Уладзімір Караткевіч. Ужо пасля выхаду ў свет першых гістарычных твораў пісьменніцы ў жанры гістарычнай прозы з'явіліся Кастусь Тарасаў, Уладзімір Арлоў, Леанід Дайнека...

Цяпер надышоў час, калі ўсё беларускае нішчыцца. І ў такіх умовах з'яўленне новых твораў, збольшага некамерцыйных, — гэта сапраўдны поспех. Нават калі твор выходзіць накладам у тысячу экземпляраў, калі, каб выдаць твор, трэба залезці ў даўгі...

— Вольга Міхайлаўна, Ваша гістарычная проза ў справаздачным дакладзе на XV з'ездзе Саюза беларускіх пісьменнікаў названая *"нацыяўтваральнай"*. Што маецца на ўвазе?

— Мабыць, тое, што гістарычныя раманы, якія адкрываюць тыя ці іншыя старонкі нацыянальнага жыцця, — гэта не проста мастацкі твор. Нацыі трэба ведаць уласныя шляхі, па якіх яна ішла ў мінулым, каб ясней бачыць Будучае, бо гісторыя, як вядома, развіваецца па спіралі. Нацыя, якая не вучыцца на ўласных памылках, а на кожным вітку гэтай спіралі нібы пачынае ўсё спачатку, непазбежна траціць сваю стваральную энергію і асуджаная, у рэшце рэшт, на знікненне. Тое ж адбываецца, калі яна спрабуе жыць у мінулым, як гэта робіцца сёння ў Беларусі, дзе савецкі час і яго праявы спрабуюць закансерваваць, але не як гістарычныя экспанаты, а як надзённыя рэаліі.

— Аповесць "Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба" — Ваша шостая гістарычная кніга. Не магу не спытаць: якім чынам Вы замацаваліся на полі гістарычнай прозы — у традыцыйна мужчынскім жанры? Глядзіце: Генрых Сянкевіч, Баляслаў Прус, Уладзімір Караткевіч — менавіта пісьменнікі-мужчыны дасягнулі найбольшых поспехаў на гэтай ніве…

— Мне здаецца, што сёння надыходзіць Час Жанчыны. Раней было немагчыма, каб жанчына была прэзідэнтам альбо, скажам, міністрам абароны. Нават лекарам яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя жанчына быць амаль што не магла — толькі медыцынскай сястрой. Цывілізацыя вызваліла жанчыну ад безлічы чорнай побытавай працы і дала ёй роўныя правы з мужчынам, што ў сваю чаргу дало магчымасць паглыблення ў хітраспляценні гісторыі, што сапраўды вельмі цяжка і адказна.

— Вольга Міхайлаўна, набыць Вашу кнігу ў беларускіх кнігарнях немагчыма. Як, зрэшты, і ўвогуле большасць добрай беларускай літаратуры. Прабіцца сёння да чытача не лягчэй, чым напісаць кнігу. Неяк Вы сказалі, што гэта — праявы забароны на прафесію, якая не толькі дэфакта, але і дэ-юрэ існуе ў краіне…

— З аднаго боку, я разумею, чаму сяброў Саюза беларускіх пісьменнікаў стараюцца не дапусціць да чытача: мы пастаянна гаворым пра дыскрымінацыю ў Беларусі ўсяго беларускага — таго, што напрацавалі ў тысячагоддзях сваёй гісторыі нашы продкі і ад чаго адмаўляцца не проста кашчунна, але і неразумна. Любая нацыя зберагае мову і культуру як найвялікшы скарб. Ды гэта — калі праводзяць палітыку, выгадную СВАЙМУ народу. Калі ж гаворка ідзе пра, кажучы сучасным слэнгам, "зачыстку" жыццёвай прасторы для іншага народа, — тады ўсё ўкладваецца ў пэўную схему і робіцца зразумелым, каму і чаму патрэбна знішчаць усё беларускае, пакідаючы на паверхні толькі дробныя этнаграфічныя прыкметы нацыі. Іх потым, калі нас, не дай Божа, зробяць АДЗІНЫМ народам з рускімі, лёгка будзе вычысціць, растварыць.

Сапраўды, хто цяпер знойдзе якія-небудзь прыкметы, да прыкладу, весі, чудзі, меры і іншых народаў, што бясследна растварыліся на агромністых прасторах нашае ўсходняе суседкі?!

З другога боку, мне ўсё яшчэ незразумела: няўжо беларусы не бачаць, да чаго вядзе сённяшняя палітыка ўлады?

— Вы гаварылі пра забарону на прафесію…

— У газеце "Наша слова" друкавалася распараджэнне міністра адукацыі Радзькова аб тым, што выступленні сяброў Саюза беларускіх пісьменнікаў у школах і ВНУ могуць адбывацца толькі з дазволу ІХНЯГА, гэта значыць — "Саюза пісьменнікаў Беларусі"...

Гэтае распараджэнне абсалютна беззаконнае, паколькі адна грамадская арганізацыя НЕ МАЕ ПРАВА ўказваць другой, з кім яна можа наладжваць кантакты. Калі б у нас дзейнічалі законы, Генеральны пракурор адразу б мусіў апратэставаць такое распараджэнне міністра. Нам вядома таксама, што міністэрствы інфармацыі і культуры неафіцыйна падключыліся да гэтай антызаконнай акцыі, бо і бібліятэкі баяцца зараз прымаць пісьменнікаў, чые творы стаяць у школьных праграмах. Такім чынам, разам з забаронай нават на ўзгадванне нашых імёнаў на радыё, тэлебачанні, нам не прабіцца і на старонкі дзяржаўных газет. Нас не друкуюць афіцыйныя выдавецтвы, найперш "Мастацкая літаратура". Што гэта як не забарона на прафесію? Новаствораны саюз таксама "шчыруе". Ён не канкурыруе з намі сваімі творамі, а стараецца ЗАБАРАНІЦЬ нашы, практычна выконваючы карныя функцыі разам з уладай. Між тым некалі імёны тых, хто быў выкарыстаны ўладай і ўдзельнічаў у рэпрэсіях (а кожны сябра творчага саюза нясе гэтую калектыўную адказнасць), будуць праклятыя нашчадкамі. Украіна назвала галадамор 30-х гадоў генацыдам. Тыя, хто стварае сённяшні духоўны голад, таксама некалі будуць аб'яўлены творцамі генацыду.

— Якім жа чынам пісьменнікі, пазбаўленыя магчымасці выдання сваіх твораў, публічных выступаў, зарабляюць сабе на жыццё?

— Зарабляць на жыццё творчасцю пісьменнік сёння не можа (хіба што тыя, хто належыць да праўладнага саюза). Для тых Міністэрства культуры мае нешта накшталт літаратурных грантаў, якія даюць штогод двум-тром пісьменнікам — калі іх яшчэ не адмянілі. На працу нас не бяруць. Наадварот, выстаўляюць і з той, што была, па самай дробнай прычыне. Чатыры гады, напрыклад, быў без працы выдатны паэт Сяргей Законнікаў. Ва ўсім свеце пісьменнікі выступаюць за ганарар, у нас жа выступаць, як я пісала, становіцца ўсё больш праблематычна. Кніжкі мы выдаем на ўласныя грошы. Але затое я маю чыстае сумленне: я працую дзеля свайго народа як магу, і еду туды, куды яшчэ запрашаюць, хаця б і ў маленькую вёску. Літаратура давала нам у мінулыя гады немалыя магчымасці, трэба адслужыць ёй сёння, калі яе спрабуюць знішчыць і замяніць сурагатам.

— Палітыка, на жаль, падмяла пад сябе і літаратуру. Сённяшнія ідэалагізацыя грамадства і літаратуры, у прыватнасці, нават цэнзура бачацца не такімі страшнымі, як частковае зрошчванне палітыкі з літаратурай. Куды нас гэта завядзе?

— Паверце, я ніколі не хацела займацца палітыкай. Ды і не займаюся ёю. Я люблю свой народ і хачу, каб ён застаўся ў гісторыі. Не мая віна, што гэтая любоў зрабілася палітыкай...

— І апошняе, Вольга Міхайлаўна. Вы ніколі не шкадавалі, што ў сярэдзіне 1990-х круемы Вамі Саюз беларускіх пісьменнікаў адмовіўся стаць прыдаткам улады, ейнай абслугай у інтэлектуальнай сферы? Глядзіш — можа, і не было б экспрапрыяцыі маёмасці СБП, пісьменнікі не гібелі б з голаду, не думалі б, як выдаць свой твор…

— ...І спакойна глядзелі б, як узводзяцца новыя помнікі Дзяржынскаму — выканаўцу самых страшных рэпрэсій у гісторыі чалавецтва? Як крывадушнічаюць вышэйшыя дзяржаўныя асобы ці праўладныя нашы калегі, ухваляючы альбо замоўчваючы знішчэнне самых простых свабод чалавека — свабоды слова і думкі? І ўсё — дзеля ўласнага карыта: кніжкі, ганарару, ласкавага паляпвання па плячы, калі ты бессаромна ілжэш пра *"росквіт беларускай мовы"?* А што будзе з нацыяй, з тваім народам?!

Нядаўна з нагоды нашага чарговага з'езда адзін з калег, якія яшчэ не перабеглі ў новаствораную арганізацыю, але стала працуюць у нашым былым выданні, папракнуў нас, што мы *"сядзім у акопах"*, а жыццё нібыта ідзе міма. Так і хочацца задаць яму пытанне: якое ж жыццё ідзе па-за *"акопамі"?* Свабоднае, вольнае, з павагай да цябе і тваіх кніжак? Да той мовы, на якой ты яшчэ пішаш? А што робяць з тваім патэнцыяльным чытачом, які (і я ведаю такія прыклады ў мінскіх школах!) папросту ўжо не разумее паловы з таго, што ты яму гаворыш, бо англійскую ці кітайскую ён ведае лепей? Ды і ці сам ён выбіраў мову навучання? Ці пытаўся хто пра гэта ў яго і ягоных бацькоў? І шмат яшчэ нязручных пытанняў магла б я задаць... Але дыскусій у нас даўно ўжо няма, яшчэ з тых часоў, калі ГВАЛТАМ забралі ў нашага творчага саюза і наш Дом, і нашыя выданні. Што, дарэчы, вельмі зручна для тых, хто хацеў бы забыцца на такую "хімеру", як сумленне...

Але я жыву з надзеяй, што некаторыя з сённяшніх *"абслугоўцаў"* усё ж апусцяць некалі вочы альбо пабягуць выразаць свае опусы з газет, дзе яны цяпер так актыўна і ахвотна друкуюцца. Мне выразаць нічога не патрэбна, і ў спакойным сумленні сёння мая сіла, нягледзячы на ўсе ўціскі. І калі мяне сёння нават не ўзгадваюць, гаворачы пра 15-гадовы юбілей газеты "Культура", першым рэдактарам якой я ўсё роўна застануся назаўсёды (нават наша "міністэрства праўды" гэтага не адменіць!), то я думаю пра тое, што віленскім пакутнікам, якія аддалі жыццё за свае перакананні, за свабоду думак і ўчынкаў, было нашмат цяжэй, чым нам, іхнім далёкім нашчадкам...

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

Аляксандр Мілінкевіч запрасіў некалькі соцень еўрапейскіх палітыкаў і ўсіх паслоў краін Еўрасаюза, прадстаўленых у Мінску, на святкаванне Дня волі 25 сакавіка

Некаторыя палітыкі не прыедуць, але ўжо даслалі лісты падтрымкі. Так, Аляксандр Мілінкевіч атрымаў ліст са словамі падтрымкі ад кандыдата на пасаду прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі.

Між іншага Нікаля Сарказі адзначае:

"Хачу выказаць Вам, гэтак-сама і ўсім актывістам дэмакратычных сіл Беларусі мае найлепшыя пажаданні ў 2007 годзе. У Вашай цяжкай барацьбе за перамогу справядлівасці і дэмакратыі будзьце ўпэўненымі ў маёй самай поўнай падтрымцы".

Нікаля Сарказі выказаў спадзяванне, што сітуацыя ў Беларусі зменіцца ў найбліжэйшы час, што дазволіць яму наведаць Мінск.

Нагадаем, што Нікаля Сарказі з'яўляецца міністрам унутраных спраў Францыі, лідэрам кіруючай партыі "Саюз за народны рух" і, магчыма, будучым прэзідэнтам Францыі.

Ул.інф.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Не дамовіліся

Індывідуальныя прадпрымальнікі і супрацоўнікі камітэта па прадпрымальніцтве Мінскага гарвыканкама правялі чарговую сустрэчу, на якой абмяркоўваліся новыя ўмовы працы ІП, якія гандлююць парфумерыяй. У адміністрацыю Маскоўскага раёна прыйшлі каля 100 прадпрымальнікаў. Чакалася, што на пытанні ІП адкажа намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур, аднак на сустрэчу ён не прыйшоў.

Як паведамлялася раней, з 1 красавіка ІП змогуць гандляваць парфумерна-касметычнай прадукцыяй толькі пры наяўнасці ліцэнзіі на знешнегандлёвую дзейнасць, што прыраўноўвае іх да юрыдычных асоб. Прадпрымальнікі дабіваліся адмены гэтага рашэння. Але безвынікова. "Чыноўнікі далі нам зразумець: пераходзьце ў юрыдычныя асобы, насустрач вам ніхто не пойдзе. Але многія ІП проста не маюць магчымасцяў для стварэння фірмы або прадпрыемства", — так пракаментавала БелаПАН вынікі сустрэчы адна з яе ўдзельніц, актывістка Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Перспектыва".

Паводле яе слоў, у выніку ўвядзення новых правілаў ІП не змогуць гандляваць парфумерыяй вядомых брэндаў. "З прапанаваных прадпрымальнікам фірм, што маюць ліцэнзію на імпарт, толькі дзве — "Краўт" і "Локрум" — гандлююць дарагой парфумай. Аднак асартымент у іх зусім невялікі, ды і з названага паловы няма ў наяўнасці. Акрамя таго, мінімальная сума замовы ў гэтых фірм — 10 млн рублёў. Цэны на опт у іх вышэйшыя, чым у нас у розніцу", — зазначыла актывістка "Перспектывы".

У прадпрымальнікаў застаецца месяц на тое, каб закупіць тавар, рэшткамі якога можна будзе гандляваць і пасля 1 красавіка. "За кароткі тэрмін нашы запасы скончацца, новага тавару не будзе, і мы або пяройдзем на іншыя тавары, або сыдзем з прадпрымальніцтва наогул. Пакупнікам давядзецца ісці ў дарагія буцікі, якія ў Мінску можна пералічыць на пальцах", — заявіла ўдзельніца сустрэчы.

На думку экспертаў, у сувязі з новымі правіламі гандлю парфумай, цэны на яе павысяцца не менш чым на 50%.

Генадзь ШАРЫПКІН.

СЛУЧАЙ

«ЧП» с последствиями

*Витебчанам памятны события, когда сотрудники милиции переусердствовали во время патрулирования по ночному городу и убили студента медицинского института **Александра Баранова**. Тогда прокуратура и милиция попытались замять скандальное дело, но отец убитого, кстати, преподаватель этого же вуза, подняв на ноги общественность и прессу, не позволил преступникам уйти от возмездия. Суд приговорил трех убийц к разным срокам наказания. УВД Витебского облисполкома по решению суда выплатило компенсацию за моральный и материальный ущерб семье погибшего.*

Кстати, в Витебске это не единственный случай, когда милиционеры до смерти избивали задержанных. И вот — совсем свежее ЧП. В конце декабря минувшего года 37-летний врач-хирург Больницы скорой помощи Андрей Д. возвращался из бани домой. На автобусной остановке (перекресток Московского проспекта и Смоленской улицы) обратил внимание на лежавшего возле ларька человека, одежда которого была грязной, — похоже, это был бомж. Хирургу не раз приходилось иметь дело с такими людьми. Он склонился над лежавшим. Профессиональный долг обязывал оказать помощь человеку. Не успел Андрей расспросить мужчину, как рядом появились стражи порядка. Бомжа они отпустили с миром, а хирурга пригласили в "воронок"...

"Я врач, — пытался объяснить Андрей. — *Хотел оказать медицинскую помощь человеку. Я выпил только пива".*

Но милиционеры везли его в отделение. По словам Андрея, его били около двух часов. Потом задержанному потребовалась "скорая помощь".

По воле случая Андрея Д. отвезли в ту же больницу, где он работает. Коллеги около четырех часов боролись за его жизнь и спасли от смерти. На теле хирурга было множество ушибов, обнаружилась гематома почки. Врачи сумели почку сохранить. Отец Андрея в ту ночь, когда узнал, что сын на операционном столе, поседел. Андрей — единственный сын в семье, на следующий день собирались отметить его день рождения.

По данному факту уголовное дело не возбуждалось, но в связи с заявлением потерпевшего прокуратура Октябрьского района ведет расследование. Отделом собственной безопасности УВД Витебского облисполкома расследование уже проведено, а, по словам начальника отдела **Игоря Силицкого,** поскольку в показаниях сторон есть противоречия, то результаты расследования переданы в прокуратуру. Прокурор Октябрьского района **Владимир Шалухин** пояснил, что в настоящее время проводится судмедэкспертиза, которая должна определить, при каких обстоятельствах у пострадавшего оказалось множество травм. Ведь сотрудники милиции утверждают, что они подобрали Андрея на улице уже кем-то избитым.

"Обоих конфликтующих у ларька милиция могла отпустить домой, — поясняет начальник штаба патрульно-постового полка УВД. — *Но оба были пьяны, а Андрей, по словам моих сотрудников, был просто невменяемый. Сразу начал оскорблять патрульных, бросился в драку. Этому инциденту свидетелей предостаточно. Второго отпустили домой, потому что он извинился. В отделении милиции Андрей начал биться головой о стену. У потерпевшего врожденная болезнь почки: неправильно расположена. Спешить с выводами не следует. Если эксперты дадут заключение, что травмы образовались при падении, то будут вопросы. Патрульные утверждают, что Андрей был пьян, а в медицинском заключении говорится, что алкоголя в крови Андрея не обнаружено — он был трезв. Мало ли где его избивали, а виновата милиция. Со стороны патрульных, что отпустили второго, нарушений нет. Таких ситуаций у них возникает сотни за смену".*

"Милиционеры Шешко и Маханько 22 декабря, проезжая на служебной машине, увидели, как двое граждан, находясь в пьяном угаре, устроили потасовку, — говорит временно исполняющий обязанности заместителя командира батальона ППС старший лейтенант милиции **Владимир Анюховский.** — *Вышли из автомобиля, подошли, представились. Предложили разойтись по домам. Один извинился, назвался инвалидом 3-й группы, ушел домой. Андрей стал выступать: попробуйте заберите, всех посажу. Задержали Андрея по статье 156 Уголовного кодекса (хулиганство). Он начал выражаться нецензурно. А таких людей мы не имеем права помещать в вытрезвитель. Вот если бы он лежал и был пьян до невменяемости, тогда другое дело. Сам сел в машину. При следовании в отделение милиции задержанный накинулся на водителя и начал его душить. Пришлось на дебошира надеть наручники. В отделении стали составлять рапорт и протокол досмотра. После чего Андрей пожаловался на здоровье, тут же вызвали "скорую помощь". Упал со скамейки. У нас же так всегда: если какой-то гражданин требовал "скорую" — вызываем. Врач "скорой помощи" предложил ему показать, где болит, но задержанный отказался показать ушибы, но заявил, что его избили сотрудники милиции. В больнице, куда доставили Андрея, к сотруднику милиции подошел его начальник, пытался уговорить замять это дело. На что сотрудники ответили: "Пусть подпишет протокол, что мы его задержали, и у милиции к нему нет претензий. Но Андрей отказался подписывать протокол. Если бы он вел себя нормально, его бы не задерживали, а отпустили, как и второго, к сожалению, неизвестного гражданина".*

"Мой сын вообще непьющий, — утверждает мать Андрея Алина Николаевна, — *но если пьяного человека задержала милиция, так что, надо зверски избивать? Втроем избивали ни в чем не повинного человека, который при этом находился в наручниках, а вот взять вину за содеянное и понести заслуженное возмездие от правосудия храбрости не хватает".*

"По работе, кроме как положительно, о хирурге Андрее Д. ничего сказать не могу. Очень спокойный, интеллигентный человек, хороший хирург, — говорит профессор **Юрий Мартов**. — *Надо знать прописную истину: ни один юрист на веру ничьи слова не принимает. Есть медицинские документы, подтверждающие, что доставленный в больницу был трезв. Поэтому никто не имеет права утверждать обратное. Анализы подтасовать невозможно, потому что это закрытая емкость с кровью, опечатанная, отправленная в лабораторию судебной медицины, где и делается анализ крови. Все его тело было настолько помято, как будто по нему трактор проехал. Молодой, здоровый, работал в хирургии. И вдруг — такая трагедия... Судмедэкспертиза способна определить причину травм потерпевшего".*

"Мой коллега 22 декабря был трезвый", — утверждает хирург **Виктор Балейко**, делавший операцию Андрею.

"Наручники на меня надели в отделении милиции, — вспоминает Андрей, — *за что били, я не знаю, прапорщик бил со знанием дела и особенно жестоко. Когда "скорая помощь" доставила в больницу, то я, как человек терпеливый, попросил отвезти меня домой, где надеялся отлежаться. Но милиция, сопровождавшая "скорую", настаивала вернуться в отделение, где, по их утверждению, я должен был подписать протокол: дескать, я ломал и грабил ларек. Все же я поехал в отделение, но на машине коллег. Милиция следовала за нами. Подъехали к отделению милиции, мне стало совсем плохо. И меня срочно отвезли на операционный стол в больницу. Никаких протоколов я не подписывал. Пока шла операция, милиционеры, меня избивавшие, находились в больнице, очень волновались, умру или нет".*

Ну что ж, выслушали мнение обеих сторон. Выводы делать не будем. Дождемся ответа судмедэкспертов, после чего к данной теме обязательно вернемся. Хирург Андрей Д. до сих пор на больничном.

Владимир ЖИГУЛОВ.

P.S. ***По словам прокурора Октябрьского района Владимира Шалухина, в суде рассматривается еще одно дело по факту избиения человека в отделе Октябрьского РОВД. Так кого бережет наша милиция?***

КСТАТИ

По словам министра внутренних дел генерал-лейтенанта **Владимира Наумова**, за минувший год к уголовной ответственности было привлечено около 200 сотрудников органов внутренних дел. Из них около 150 были осуждены к отбыванию наказания в местах лишения свободы.

«Слодыч» вступает в брак с «Коммунаркой»

Белорусское ОАО "Слодыч", крупнейшее в Беларуси предприятие по выпуску мучных кондитерских изделий, рассматривает возможность присоединения к ОАО "Коммунарка", сообщили агентству ПРАЙМ-ТАСС на предприятии.

Вопрос о присоединении "Слодыча" будет вынесен на рассмотрение собрания акционеров этого ОАО, которое пройдет 30 марта 2007 г.

Собрание акционеров также должно утвердить отчет о финансовой деятельности ОАО "Слодыч" за 2006 г., результаты аудиторской проверки и отчет ревизионной комиссии по результатам финансово-хозяйственной деятельности общества, а также утвердить устав ОАО в новой редакции и рассмотреть другие вопросы.

ОАО "Кондитерская фабрика "Слодыч" создано в 2001 г., выпускает около 12 тысяч тонн печенья в год. ОАО "Коммунарка", одно из двух крупнейших предприятий кондитерской отрасли страны, выпускает кондитерскую продукцию с 1931 г. Предприятие преобразовано в ОАО в мае 1994 года.

І ТАКОЕ БЫВАЕ

Калі мільёны еўра не ў радасць…

Былы галоўны трэнер зборнай Беларусі па футболе Анатоль Байдачны, аказваецца, адмовіўся ад паўтара мільёна еўра і зараз трэніруе "Дарыду" з Мінскага раёна.

"Адмовіўся, калі кітайцы прапаноўвалі, гэта ж не такія вялікія грошы, — смяецца Анатоль Мікалаевіч. — *Я вось праз некалькі хвілін з "Дарыдой" у Турцыю на зборы з'язджаю (размова адбывалася ўвечары ў аўторак), так што работы і тут хапае..."*

Па словах Анатоля Байдачнага, кантракт на чатыры гады з зарплатай у 1,5 мільёна еўра за гэты перыяд яму прапаноўваў кітайскі клуб "Цяньцзынь". Беларускі трэнер адмовіўся і... праз нейкі час узначаліў "Дарыду" са Ждановіч.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СМЕХОТУРА

Уважаемая редакция!
Я все время считал, что "Народная воля" издается для умных людей, но видел, что вашу газету читают и остальные. Например, "Народную волю" я увидел в Управлении юстиции, а также при мне подавали вашу газету и прокурору (называется конкретная фамилия, имя и отчество. — Ред.), вероятно, им по долгу службы позволяют читать.

(Из письма читателя В.Д.)

У Германіі 213 чалавек на квадратны кіламетр, а ў Беларусі — толькі 47

Лукашэнкаўская прапаганда талдыча: "У Заходняй Еўропе таксама знижаецца нараджальнасць". Але ж возьмем такі паказчык, як шчыльнасць насельніцтва на квадратны кіламетр: у Польшчы — 120 чалавек, Германіі — 213, нават ва Украіне 78, а ў Беларусі толькі 47 чалавек на адзін квадратны кіламетр. Пусцее зямелька наша!

Вячаслаў СУХАРЭБСКІ, жыхар в.Русіны Баранавіцкага раёна.

Трайное забойства

Тры чалавекі былі забіты ў ноч з 3 на 4 сакавіка пасля дыскатэкі ў адным з населеных пунктаў Салігорскага раёна.

Як паведамілі БелаПАН ва УУС Мінаблвыканкама, два маладыя чалавекі, 1983-га і 1986 гадоў нараджэння, прыйшлі ў вёску на дыскатэку, дзе пасварыліся з мясцовым жыхаром і пачалі яго збіваць. Жанчыны, якія сталі сведкамі, паспрабавалі спыніць бойку. Наступныя падзеі ў абласным упраўленні ўнутраных спраў трактуюць так, што "хлопцы вырашылі ўбраць сведак". У выніку быў забіты мясцовы жыхар, з якім пабіліся маладыя людзі, адна жанчына памерла на месцы здарэння, адна — у бальніцы, яшчэ адна знаходзіцца ў цяжкім стане ў лячэбнай установе. Наступствы маглі б быць яшчэ больш трагічнымі, калі б злачынцы, якія цяпер затрыманы, не згубілі ў цемры нож, зазначылі ва УУС Мінаблвыканкама.

Для пошуку і затрымання злачынцаў быў задзейнічаны службовы сабака. Па факце трох забойстваў распачаты тры крымінальныя справы. Расследаваннем займаецца Салігорская міжраённая пракуратура.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 САКАВІКА 2007 г.

МНЕНИЕ

Доллар все-таки пошатывается?

Глава Европейского Центрального банка (ЕЦБ) Жан-Клод Трише присоединился к числу финансистов, которые предупреждают о росте рисков для мировой финансовой системы.



По его мнению, центробанки ведущих стран не должны оставлять без внимания ценовые риски. *"Мы должны оставаться очень, очень настороженными,* — отметил Трише. — *Инфляция является основной глобальной опасностью".* Быстроразвивающиеся страны, особенно азиатские с менее сложными финансовыми рынками и экономиками, по его словам, переводят огромные излишки денежных средств в США, которые и так содержат более 70% мировых сбережений. В то же время богатые нефтью ближневосточные страны также накапливают излишки ликвидности, что создает мировой дисбаланс.

Главный экономист ИК **"Тройка Диалог" Евгений Гавриленков,** соглашаясь с тем, что определенные риски существуют, не склонен их преувеличивать. *"Трише — вовсе не единственный, кто о них периодически говорит, в разное время о том же заявляли и Джордж Сорос, и бывший глава ФРС США Алан Гринспен,* — заявил аналитик в разговоре с корреспондентом "НГ". — Однако я не стал бы их преувеличивать. В быстрорастущих экономиках есть профицит, который надо куда-то девать. При этом США периодически поднимают процентные ставки, а евро — далеко не лучшая альтернатива для подобных вложений". В кризисе никто не заинтересован, и особенно те страны, которые держат большую часть своих золотовалютных резервов в американской валюте, в том числе Китай, Япония, Индия и Россия. *"Скорее всего развитие получит тенденция по плавной диверсификации запасов в сторону других мировых валют,* — отмечает Гавриленков. — *Та же Россия, например, не так давно объявила, что часть ее запасов будет номинирована в японские иены, по этому же пути пойдут и другие страны, так что ничего экстраординарного ждать не стоит".*

КОРОТКО

Президент Перу учит земляков пунктуальности

Алан Гарсиа объявил кампанию по борьбе с самой вредной привычкой, свойственной местным жителям, — опаздывать. В столице государства Лиме устроили пышный карнавал, на котором перуанский лидер объявил о новой эпохе. Отсчет начали ровно в полдень, с боем курантов на главной ратуше: *"Мы должны положить конец этой ужасной и весьма опасной традиции везде опаздывать. Эта привычка стоит нам слишком дорого. Мы приходим не вовремя и уходим не вовремя. Мы забыли, что есть такое слово — пунктуальность".*

Однако, отмечает НТВ, президенту будет трудно перевоспитать перуанцев. Они не любят спешить и считают это особенностью национального менталитета.Тяга к опозданиям не раз становилась темой анекдотов. Местные острословы даже придумали специальное понятие — "жить по перуанскому времени", что значит приходить на час позже.

Робот, способный учиться

Американские ученые сконструировали робота-гуманоида, который сам учится ходить.

Робот Декстер сделал свои первые робкие шаги лишь несколько дней спустя после того, как научился стоять. Его конструкторы утверждают, что их детище отличается от предшественников тем, что может учиться на своих ошибках.

Новый робот является результатом шестилетней работы независимой исследовательской группы Anybots, в состав которой входят три инженера.

Дэкстер способен анализировать всю эту информацию и корректировать на ее основе свои движения. Доктор Блэквелл говорит, что" ходячие" роботы, имеющиеся сейчас на рынке, такие как Асимо, производства Honda, отличаются от Декстера тем, что их создатели запрограммировали их движения заранее.

Музей советской оккупации

Президент Украины Виктор Ющенко, посетив музей советской оккупации в Тбилиси, решил построить такой же у себя на родине, сообщает "Корреспондент.net".

"Нам, безусловно, надо сделать это в Украине ради наших дедов и прадедов, ради внуков и правнуков", — сказал Ющенко. Он заявил, что ожидает критики со стороны своих оппонентов: как выразился Ющенко, "сколько там определенных сил будет неистовствовать, потому что их миссия никогда не служила украинскому народу".

(Працяг. Пачатак у №№33—38.)

Пасьля ў іншым кабінеце афармляў падпіску аб строгай сакрэтнасьці — гэта ўжо было, як ён здагадаўся, па лініі бясьпекі. Хоць і прымаў яе лысаваты чалавек у модным двухбортным пінжаку з дужа акуратна завязаным гальштукам, важнасьці было нават больш, чым у кабінеце палкоўніка. Неяк вельмі стрымана, нібы выпрабоўваючы ягоную рэакцыю, чалавек вымавіў яму ў твар адно толькі слова "Музыкант", і Ступак зразумеў усё. Некалі гэтую мянушку прыляпілі да яго таксама ў дужа сакрэтным аддзеле перад адпраўкай у Афган. З тае пары, праўда, ніхто яму пра яе не напамінаў, і ён ужо думаў: забыліся. Аж не, не забыліся. Зрэшты, цяпер ад яго нічога не патрабавалася, а гуляць з імі ў тыя сакрэтныя гулі ўвогуле было няцяжка, хай пацешацца. І ён усё падпісаў.

Мусіць, да паўдня, аднак, усе паперы былі афармленыя, якія забрала ў яго прыгожая, у міліцэйскай форме дзяўчына з дужа суровым позіркам і дзьвюма зоркамі на пагонах. У апошні момант ён нават падміргнуў ёй, ды тая не павяла і брывом, склала ягоныя паперы ў шыкоўную зялёную папку і замкнула ў шэры сейф у кутку. Значыць, будзе захоўвацца вечна і сакрэтна, падумаў Ступак. Пасьля ўжо іншы, белабрысы міліцэйскі сяржант павёз яго кудысьці ў горад. Спакваля Ступак пачаў пазнаваць вуліцы, здаецца, іхні "уазік" кіраваў у шпіталь МУС. "Гэта навошта?" — спытаў Ступак. "А медкамісія! — проста і дабразычліва адказаў белабрысы шафёр і хіхікнуў: — Праверка на СНІД".

Тое ўжо мала Ступаку падабалася, хутчэй — не падабалася зусім. На якога д'ябла! — думаў ён, губляючы трываньне ад гэтага падрабязнага дасьледваньня ягонай асобы. Што ён ім будзе служыць? У яго іншая мэта, яму б толькі дапяцца да зброі. Мабыць жа, дадуць якога "Сьцечкіна" ці "Калашнікава", і ён падловіць момант. Ягонае здароўе яго мала цікавіла, хай не цікавіць яно і гэтых.

Але гэтых якраз дужа цікавіла. Да цямна яго вадзілі з кабінету ў кабінет, з паверху на паверх, — слухалі, мацалі, вымервалі на апаратуры, высьвечвалі ягоныя вантробы на мільготкіх маніторах. Але ўсё было ў норме, ціск жа, сказалі, бы ў юнака, і яго пахвалілі. "Алкаголь ужываеце? — папытаўся строгі доктар, на плячах пад халатам якога мулялі цьвярдыя пагоны. Ступак з наіўным выглядам пакруціў галавой: "Ну што вы!" Трохі затрымаў на ім свой пранізьлівы позірк хірург, як убачыў сіняватую адмеціну на плячы. "Што — агнястрэльная?" — "Афган", — коратка адказаў Ступак. "А то — ушыб?" — даволі груба памацаў ён сьлед ад нядаўняй амапаўскай палкі. "Упаў..." — "Па п'янцы?" — ухмыльнуўся доктар, штось разумеючы. Ступак тое пакінуў без адказу — здаецца, яны і так паразумеліся. Далей была кардыяграма з правадамі, якія аблыталі ягоныя рукі і ногі, акуліст са сваёй табліцай на сьцяне і ў канцы дзіўнаватая гаворка з псіхіятарам. Адзінае, што з яе запомніў Ступак, былі прыдзірлівыя пытаньні пра выпіўку і наркоту. І тое, і іншае Ступак рашуча адмаўляў, сказаў, што ніколі ні-ні, успамінаючы пры тым, як у тым жа Афгане, і неаднойчы, яны добра-такі кайфавалі анашой. Шкада, пасьля кінуў. Каб ня кінуў, можа б, лепей было, нечакана падумаў ён, седзячы перад хітраванам-псіхіятарам. Здаецца, стан ягонага здароўя іх задаволіў. Яго тым болей.

Да свайго гаражу ён прыплёўся, калі ўжо сьцямнела, побач на падворку ўгары сьвяціўся ліхтар, сьвяціліся вокны ў хрушчоўках. Ведаў, цяпер там усе ўтаропіліся ў свае зіхоткія скрынкі — хто на музычныя шоу, крывуляк-танцуляк са шнурамі ў руках, а болей, мусіць, на чарговы нумар самога. Амаль кожны вечар той выступаў са сваім гіпнозам — то пагрозьліва-строга, калі гаварыў пра апазіцыю, якая мае ад ЦРУ заданьне яго зьнішчыць, то шчодра адорваючы ўсіх белазубай усьмешкай з-пад шыкоўных вусоў, калі зьвяртаўся да гледачоў. Асабліва глядачак, якіх ён часьцяком на прамілы Бог прасіў падтрымаць яго ў сьвятой барацьбе за дабрабыт народу. Слухаючы яго лісьлівыя звароты, жанчыны былі гатовыя на што хочаш, — з такімі просьбамі да іх ніхто раней не зьвяртаўся. Тым болей з вялікіх начальнікаў, не памінаючы ўжо ўласных мужоў, якія даўно не прызнавалі нічога ў жыцьці, апроч бутэлькі. Мужчыны не любілі палітыку, якая цікавіла іх усё меней, чым горш жылося. Затое яна ўсё болей захапляла жанчын, асабліва з тае прычыны, што ў ёй верхаводзіў ён — такі выбітны, прывабны, амаль нежанаты, які ўвасабляў недасяжныя жаночыя мары аб мужчыне-кавалеру, мужчыне-лідэру. І тым вабіў.

Ну, але засталося нядоўга.

Так думаў Ступак, зласьліва чакаючы, калі яго паклічуць зноў. Павінны ж урэшце паклікаць, ён ужо прагнуў таго. Хоць бы таму, што ежы не было зусім, два дні таму пазычыў пару тысячаў у былога суседа па кватэры, якога падпільнаваў у двары. Перш чым выняць яму паперку, сусед добра паплакаўся, наракаючы на жыцьцё, малую пенсію, лайдачку дачку, якая ня хоча працаваць і звыкла жыць на ягоную пенсію. Ступак суцешыў яго, што хутка атрымае зарплату і разьлічыцца. І апусьціў долу вочы, бо глядзець на старога было няёмка.

На гэты раз да яго завітаў сам Шпак, на тым самым вішнёвага колеру "Пежо", у камуфляжы, але ўжо з пагонамі маёра на шырокіх плячах. "Хутка, аднак, у іх растуць кадры!" — з нечаканай зайздрасьцю падумаў Ступак, сядаючы поруч з колішнім калегам-прапаршчыкам. Гэты маёр пачаў распавядаць яму, як шмат даводзіцца працаваць (работа ж не нармаваная), як тлумна і небясьпечна, хоць ганарова і адказна. "А зарплата як?" — стрымана папытаўся Ступак пра тое, што яго цяпер найболей цікавіла. "Зарплата нішто. Табе такой і ня сьнілася, — сказаў Шпак. — Напачатку тры мільёны, ну пад'ёмныя і так далей. Не пашкадуеш".

Ступак унутрана парадаваўся, хоць і не падаў знаку, ды папраўдзе і слаба паверыў, прыпамятаўшы дацэнта Мінкевіча з яго шасьцюдзесяцьцю мільёнамі. Можа, маёр Шпак і атрымлівае тры мільёны, а ён жа прапаршчык...

— Пакуль будзеш жыць у афіцэрскай гасьцініцы. А там пабачым, — сказаў Шпак, як яны пад'ехалі да чарговай бетоннай сьцяны з прахадной і шлагбаўмам.

Тут, аднак, аказалася амапаўская база ці што. Некалькі гадзінаў Ступак з такімі, як сам, навічкамі, маладымі хлопцамі са сьвежымі ружовымі тварамі, абмундзіроўваўся на забітым скрынкамі ды цюкамі рэчавым складзе. Яму выдалі цэлую кучу абмундзіроўкі — зялёную і стракатую, колеру сьмецьця, сьвяточную і паўсядзённую, моцныя грубыя чаравікі, пілотку і берэт, цёплую куртку і цяльняшкі — аж тры штукі. І нават добры шкумат бязі — на каўнерыкі. Як у войску. Толькі ў войску так шмат ніколі не давалі, эканомілі. Хлопцам, што пераапраналіся з ім разам, дужа спадабаліся дзягі. "Афіцэрскія", — з захапленьнем сказаў адзін, трохі старэйшы за астатніх. Дзягі сапраўды былі адмысловыя, з таўстой, прашытай скуры пры ладных спражках, ня тое што з металічнымі бляхамі ў войску. Ступак пераапрануўся ў новае, са сьвежым прыемным пахам; свае сьмярдзючыя трусы, азірнуўшыся, піхнуў у бляшаную урну, і яго павялі цераз падворак у афіцэрскую гасьцініцу.

Першы раз за лета ён з асалодай распрастаўся на чыстай новай прасьціне, уладкаваў схуднелыя плечы на ладнай падушцы. Заўтра сказалі падстрыгчыся, — хай, ён падстрыжэцца. І яшчэ, сказалі, вусы можна не збрываць, тут паважаюць вусатых. Другі ложак у пакоі быў акуратна засланы, мабыць, кагосьці чакаў. Можа, таксама новенькага.

Служба пашыралася, камплектавалася, дасканалілася, — як і мае быць пры моцнай уладзе. Цікава было Ступаку другі раз перажываць тое, што ўжо было перажыта ў яго вайсковым юнацтве, у Афгане і пасьля.

Дэмабілізаваўшыся сем гадоў таму, думаў, што перажытое ніколі ўжо не паўторыцца. Аж во, абяцала паўтарыцца, хоць і на іншым вітку жыцьця.

Але дужа падобным. Як да таго трэба паставіцца, часам ён пераставаў разумець. Адно адчуваў, што будзе сыты, дагледжаны, а там... А там пабачым, як яно будзе, думаў Ступак.

Збылося амаль так, як ён меркаваў. Назаўтра ён добра пасьнедаў на першым паверсе ў амапаўскай сталоўцы, зьеў пару катлетаў з гарнірам, макаронную запяканку, выпіў шклянку ражанкі і яшчэ — салодкай гарбаты. Бы на курорце ці ў Доме адпачынку. Навакол з куды меншым, чым у яго, апетытам сьнедалі за сталамі іншыя амапаўцы, маладыя хлопцы з сяржанцкімі пагонамі на плячах. У яго пагонаў яшчэ не было, і ён трохі турбаваўся з тае прычыны. Усё ж у войску ці ў міліцыі ўсе павінны былі мець пагоны, якія і вырашалі статус кожнага. Без пагонаў ты ніхто. Проста цывільны чалавек — ня болей.

Той і наступныя два дні былі заняткі — у класах і на плацы, як некалі ў войску. Хіба што, апроч тэорыі, іх вучылі нейкай дзівоснай практыцы — як адбіваць напады дэманстрантаў, нападаць самім, строіцца і перастройвацца ў шчыльныя шэрагі. Вывучалі таксама ўласьцівасьці розных сьлезацечных і баявых газаў — у балончыках, дымавых шашках, гранатах. У праграме таксама значыліся найноўшыя сакрэтныя сродкі барацьбы з тэрарыстамі, экстрэмістамі і радыкаламі. Ступак слухаў усё ня надта ўважна, бы ў сьне; будова і ўласьцівасьці хімічных сродкаў яго ня дужа цікавілі, яго цікавіла зброя. Але пра зброю чамусьці гаворкі пакуль не было.

Пасьля ён зразумеў, чаму не было.

Мабыць, усе гэтыя хлопцы-амапаўцы, хто раней, хто пазьней, служылі ў войску і вайсковую зброю ведалі, стралялі ня раз з АК і кулямётаў — то не было для іх навіной. Ім жа тут рыхтавалі нейкую навіну, і яны чакалі яе.

Але аднойчы, яшчэ бяззбройных, іх паднялі па трывозе на золку, загадалі разабраць баявое снаражэньне — белыя шчыты, шлемы, надзець цяжкія бронекамізэлькі, пабраць палкі і — хутчэй на пасадку ў "Камазы". Яшчэ цалкам не разьвіднела, яны кудысь ехалі, спыняліся, паварочвалі назад, бы стараючыся заблытаць ворага, і толькі гадзінаў у дзесяць выгрузіліся каля рэзідэнцыі самога. Тут ужо быў маёр Шпак, куча іншых маёраў ды палкоўнікаў; амапаўцаў выстраілі ў тры шэрагі ўпоперак вуліцы — якраз, як тады, улетку, калі ён трапіў у перадзелку. Як бы ня трапіць зноў, засьцярожліва падумаў Ступак, апынуўшыся ў пярэднім шэрагу. Як і ўсе, ён стаяў плячо да пляча з суседзямі, маладымі хлопцамі, трымаючы ля ног лёгкі дзюралевы шчыт, з гумовым "дэмакратызатарам" у правай руцэ. Рука і плячо амаль перасталі балець, і ён, каб упэўніцца ў тым, трохі памахаў над сабой палкай і сьцішыўся. Нейкі час на вуліцы было амаль пуста, рух транспарту спыніўся, прасьпект перакрылі з абодвух бакоў. Увогуле навакол было спакойна і ціха, калі б не трывожная ўзьвінчанасьць начальства, якое, бы ўгарэлае, насілася перад амапаўцамі; некаторыя бегалі да чорнай "Волгі", што прытулілася да будынку ззаду. Усе чакалі.

Гадзіны пасьля дзясятай здаля на вуліцы паявіліся дэманстранты. Сьпярша сталі відаць над іх галовамі бел-чырвона-белыя сьцягі на высокіх лёгкіх шастках, плакаты; пасьля — і пярэднія шэрагі з маладых мужчынаў і дзяўчатаў, што з песьнямі нетаропка ішлі па прасьпекце. Некаторыя вялі за рукі дзяцей. Ступак спрабаваў зразумець, колькі іх там было, вызначыць хоць прыблізна, ды ня здолеў. Было надта шмат. Тысячы. Згледзеўшы перашкоду ўпоперак прасьпекту, дэманстранты жвавей замахалі сьцягамі, данесьліся крыкі "Ганьба!", "Здраднікі!", "Гестапа!" Хтосьці з начальства вёртка крутануўся перад шэрагамі. "Яны нас абражаюць!" — прарэзьлівым голасам крыкнуў да амапаўцаў. Ступак унутрана хмыкнуў, пераборваючы, аднак, лёгкі страхавіты подых з прасьпекту. Усё ж рабілася ніякавата. Мусіць, стычкі ім не пазьбегнуць, як бы ня сталася горш, чым улетку. У той час ззаду прагучала каманда, усе ў шэрагу апусьцілі на твары празрыстыя ахоўныя казыркі — падрыхтаваліся. Дэманстранты тым часам падышлі бліжэй, добра сталі відаць пярэднія — маладыя мужчыны, хлопцы і дзяўчаты, што, пабраўшыся за рукі, як і раней, нясьпешна падыходзілі ўсё бліжэй. На самай сярэдзіне калоны пад вялізным крыжастым штандарам крочыў высокі хударлявы чалавек з лысаватай галавой і туга сьцятымі пашчэнкамі. То быў знакаміты Зянон, яго Ступак неяк бачыў вясной на мітынгу. Калі яны падышлі яшчэ бліжэй, ззаду за АМАПАм зноў гыркнула каманда, і ўсе тры амапаўскія шэрагі ўзарваліся жалезным грукатам, які заглушыў усю вуліцу.Ступак разам з усімі шалёна лупіў па шчыце гумоваю палкай і ўнутрана пасьміхаўся з дэманстрантаў. Спалохаліся ці не, было невядома, але, падышоўшы яшчэ бліжэй, шэсьце спынілася. Наперад з мегафонам у руках выйшаў Зянон.

(Працяг на 6-й стар.)

Ваш газ у нас!

Бельгийский премьер неожиданно отреагировал на подписание договора о строительстве в его стране хранилищ для российского газа.

ИНТЕРЕСНО

Осторожно, подделки

Фальшивые лекарства, заполонившие развивающиеся страны, порой представляют смертельную угрозу для человека, предупреждает Международный совет ООН по контролю за наркотиками.

В докладе базирующейся в Вене организации говорится, что до 50% всех медикаментов, отпускающихся в этих странах по рецепту, — это подделки.

Кроме того, добавляют авторы документа, оборот от злоупотребления такими лекарствами вскоре превысит объемы мировой торговли запрещенными наркотическими препаратами. Уже сегодня, по данным Совета, в некоторых районах Европы, Африки и Южной Азии поддельные медикаменты обогнали по обороту героин, кокаин и экстази. Что касается США, то там злоупотребления фальшивыми лекарствами уступают только марихуане.

Назарбаев научит сограждан говорить на трех языках

Президент Казахстана Нурсултан Назарбаев предложил начать поэтапную реализацию культурного проекта "Триединство языков". Об этом говорится в послании главы государства народу республики под названием "30 важнейших направлений нашей внутренней и внешней политики".

"Казахстан должен восприниматься во всем мире как высокообразованная страна, население которой пользуется тремя языками. Это казахский язык — государственный язык, русский язык — как язык межнационального общения и английский язык — язык успешной интеграции в глобальную экономику", — говорится в послании президента.

Назарбаев также предложил создать "фонд духовного развития народов Казахстана", который бы занимался регулярным мониторингом и поддержкой развития культурных ценностей и традиций народов страны при помощи государственного и частного партнерства.

До конца света осталось 5 лет?

Исследователь Лоуренс Джозеф в своей книге "Апокалипсис 2012: оптимист изучает конец цивилизации" назвал предполагаемую дату конца света. По его мнению, это случится в предпоследнюю неделю декабря 2012 года.

Автор основывает свои выводы на старинных календарях и предсказаниях, которые содержатся в священных книгах древности, в том числе и Библии.

Дата 21 декабря 2012 года также фигурирует в календаре майя, который был создан около 2 тысяч лет назад. Он и сегодня поражает ученых необъяснимой точностью в подсчетах лунного года, передает ИТАР-ТАСС.

Не все витамины полезны

Датские ученые пришли к выводу, что некоторые витаминные добавки не продлевают, а наоборот, сокращают жизнь, передает НТВ. Речь идет о таких популярных антиоксидантах, как витамины А, Е и бета-каротин. Что касается витамина С и селена, то они, как выяснилось, не влияют на продолжительность жизни. Основанием для таких утверждений стало обследование 200 тысяч человек, долгое время принимавших витаминные комплексы.

Важно отметить, что речь идет о витаминах в виде таблеток, а не о тех, что поступают в организм вместе с овощами, фруктами и другой пищей.

У СОСЕДЕЙ

Что нового за Бугом?

Что нового за Бугом, то есть в Польше? Судя по почте, этот вопрос интересует многих белорусов. Поэтому продолжаем следить за новостями в соседней стране. Сегодня познакомимся с фрагментами передач Польского радио и Радио Свобода.

Экономический тигр Европы

"Польша — экономический тигр Европы" — под таким заголовком газета "Дзенник" публикует статью Джозефа Штиглица, известного американского экономиста, лауреата Нобелевской премии, который в 1990-е годы возглавлял группу экономических советников президента США, а в конце 1990-х — начале 2000 года занимал должность главного экономиста Всемирного банка. Ее содержание пересказало Польское радио.

Джозеф Штиглиц считает, что Польша вошла в круг богатых стран мира.

В редакционном предисловии к статье ведущего американского эксперта в области экономики говорится, что такой хорошей конъюнктуры в Польше давно уже не было. Спустя всего лишь неполных три года участия Польши в Европейском Союзе, экономический рост может превысить 6 процентов ВВП. Польские фирмы завоевывают рынки ЕС, а в стране растет количество рабочих мест.

В статье, написанной специально для "Дзенника", Джозеф Штиглиц утверждает, что в Польше наступил огромный прогресс. Страна хорошо справилась с большинством необходимых реформ и приобрела колоссальные возможности развития. Среди государств, совершивших переход от командно-административной системы управления экономикой к свободному рынку, Польша является бесспорным лидером, — заявляет Штиглиц.

Далее автор статьи объясняет парадокс, почему сами поляки оценивают свою ситуацию столь негативно (об этом говорят опросы общественного мнения). Дело в том, считает Джозеф Штиглиц, что они сравнивают свою материальную ситуацию с Германией или Швецией и не берут во внимание соседей со стороны восточной границы, которым приходится намного тяжелее. Вместо того, чтобы жаловаться, поляки должны осознать, как много им удалось сделать, и еще более решительно пойти вперед. О благополучной ситуации в Польше свидетельствует также стремительный рост зарубежных инвестиций, — добавляет экономист.

Из Норвегии

Польша получила доступ к залежам норвежского газа и нефти на море. Премьер Ярослав Качиньский, выступая на пресс-конференции, подчеркнул, что приобретение нефтеносного и газоносного участков повысит энергетическую безопасность страны.

Министр экономики Петр Возняк сообщил, что это типичное газоносное поле. Подписан договор на приобретение 15% площади добычи. Этот участок легок в эксплуатации. Оператором участка является концерн "Бритиш Петролеум". Закупка и эксплуатация залежей — это политика правительства, направленная на диверсификацию поставок газа в Польшу.

Декоративные куры

В Польше все более популярным становится разведение декоративных кур. Об этом редком занятии рассказал на Радио Свобода Алексей Дзиковицкий. На первой общенациональной выставке, организованной Обществом любителей декоративных кур, он завел разговор с Леоном Тарасевичем — всемирно известным польским художником, профессором Академии художеств в Варшаве и по совместительству председателем Общества.

Профессор Тарасевич продолжает жить в маленькой деревушке Валилы недалеко от границы с Беларусью и после того, как он стал известным на всю Польшу человеком.

Тарасевич — автор единственного в Польше руководства по разведению декоративных кур: *"Некому было написать, вот я и написал. Нет, рисовать ничего для книги не рисовал, но там много снимков моих питомцев. Это стало первой такой книгой в Польше и первым моим опубликованным научным трудом!"*

Куры на выставке в Варшаве — самые разнообразные. От небольших, как голуби, до семивосьмикилограммовых гигантов; пестрые, серые, голосистые и не очень, с выпученными глазами и такие, у которых вообще не понятно, где именно находятся глаза. Среди кур Леона Тарасевича есть и совсем экзотические экземпляры, например, с индонезийского острова Ява: *"У них все черного цвета — мясо, кровь, кости. Четыре года назад восемь яиц привезли в Бельгию с Явы. На следующий год такие куры были уже в Германии, а еще через год я поехал в Германию, к границе с Бельгией и привез их к себе в Валилы! Вот таким был их путь в Польшу. Ну скажи мне, какой парень из наших краев поедет за девушкой под бельгийскую границу? А я за курицей поеду!"*

На новом "мерседесе" на выставку приехал далеко не один участник и посетитель. Видимо, разведение декоративных кур все же не только хобби.

Подготовил к печати Иван МАКАЛОВИЧ.

МОДНАЯ ПОЛЕМИКА

Депардье: «Мне нравятся девушки с формами»

Войдя в маленький зал ресторана, он сразу же заполняет его. И не только по причине своих внушительных размеров. Жерар Депардье чрезвычайно обаятельный, обворожительный. Представьте себе, что он, этот дерзкий Сирано, всем сердцем встал на защиту итальянской моды и женщин.

"Американцы сказали, что итальянская мода для проституток? Дело не в том, что я люблю "проституток". Когда я посещаю американские магазины, я покидаю их в полном разочаровании: эти девушки, которым нет и 14 лет, худые, сухие, одетые как 30-летние женщины!" Актер продолжил: "Ради Бога, я предпочитаю анорексичным девочкам итальянок с формами, от Софи Лорен до Моники Белуччи. Такие женщины сводят меня с ума. И потом, послушайте. Когда в Америке смотришь на женщину дольше 10 минут, на тебя подают в суд. Так кто нормальные люди, мы или они?"

Corriere Della Sera.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 САКАВІКА 2007 г.

(Працяг. Пачатак на 5-й стар.)

— Спадары паліцыянты! — магутна прагучала з мегафону і тут жа заглохла ў яшчэ болей шалёным грукаце АМАПу.

Так лідэр БНФ некалькі разоў спрабаваў зьвярнуцца да АМАПу, ды той не хацеў яго слухаць. Тады з нястройных пярэдніх шэрагаў дэманстрантаў, на якія напіралі заднія, пачалі выскокваць асобныя людзі, маладыя хлопцы, махаючы рукамі, спрабавалі нешта даводзіць амапаўцам. Зянон кінуўся да іх, каб спыніць і вярнуць назад у шэрагі, якія ўжо зьмяшаліся ў стракаты крыклівы натоўп, што пераставаў каму-небудзь падпарадкоўвацца. Заднія напіралі на пярэдніх, некаторыя на правым фланзе ўжо сутыкнуліся з амапаўцамі. Пачуліся крыкі, праз момант шэрагі дэманстрантаў зусім разбурыліся, іхні фланг перамяшаўся з амапаўскім. Грукат палкамі па шчытах неяк паволі спыніўся — усчынаўся стыхійны гвалт. Туды, налева, кінуліся начальнікі з мегафонамі, загучалі іхнія пагрозьлівыя каманды і лаянка. Там жа Ступак неўзабаве згледзеў крутаплечую постаць Шпака, які таксама шчыраваў — крычаў, камандаваў, пагражаў. Некалькі хлопцаў з плакатамі і сьцягамі амапаўцы захапілі ў свой ланцуг, але тады дэманстранты пачалі іх лупіць тым, што трымалі ў руках. Амапаўцы не саступалі, хоць і стараліся трымаць сваё месца, каб ня зрушыць строй. Але тое кепска ім удавалася — у некалькіх месцах шэрагі скрывіліся, група амапаўцаў сама апынулася ў атачэньні дэманстрантаў. Некалькі дэманстрантаў, адлучаных ад асноўнай масы, амапаўцы ціснулі да сьцяны будынку, а тыя не здаваліся. На сярэдзіну шэрагу таксама насядалі. Ступак ледзьве пасьпеў матлянуць галавой, каб ухіліцца ад удару, як бамбукавы шэст са сцягам шаснуў над ім, мусіць цаляючы ў задняга за ім амапаўца. Выпусьціўшы палку, Ступак ухапіў рукой за лёгкую палатніну сьцяга і рвануў уніз, тканіна адарвалася на палову ад дрэўка. Другім рыўком ён адарваў яе ўсю і ўхапіў сваю палку.

Стычка далей, аднак, не пайшла, мусіць Зянон дакрычаўся ўрэшце да сваіх хлопцаў, і тыя спакваля адхлынулі. Некалькіх усё ж ухапілі міліцыянты і амапаўцы. Астатнія адышліся, пачалі паварочваць па прасьпекце назад, — здаецца, яны мянялі маршрут руху на іншы. Амапаўцы, пастаяўшы трохі, сышліся па камандзе ў гурт і, перакурыўшы, пасядалі ў свае "Камазы". Ступак патроху стаў спакайнець, яўная небясьпека мінулася, але на душы было амаль што паскудна. Было такое адчуваньне, што ён улез не туды. Хаця што ён зрабіў — толькі пастаяў у страі. Нават нікога ня выцяў ні разу.

Праз дзень, аднак, тое пачуцьцё мінулася. Ён атрымаў пад'ёмныя — аж дзевяць мільёнаў "зайцоў" і перад строем — пагоны з дзьвюма зоркамі — стаў лейтэнантам. Палкоўнік, начальнік штаба, аб'явіў яму падзяку за "ўзорныя дзеяньні па адбіцьці нападу экстрэмістаў" і сказаў, што лейтэнант Ступак будзе камандаваць узводам. Што ж, узвод — справа няхітрая, ён у Афгане ўжо камандаваў узводам, хоць тады быў яшчэ старшы сяржант. Пачуваючы, як ва ўнутраных кішэнях муляла па дзьве тугія пачкі купюраў, зласьліва падумаў пра жонку, якая наўрад ці дачакалася такога набытку ад свайго гендырэктара. А ён во, займеў! Тады ж падумаў, што, мабыць, дарма прадаў гараж, які вельмі нават можа спатрэбіцца. Хоць зусім не прадаў, а задатак як-небудзь верне. Калі да таго часу Валынец ня сядзе ў турму. Ці яго не падстрэляць у пад'езьдзе. Шкада, але што ж, значыцца, такі яго лёс. У кожнага свой лёс. Пра свой прывязьлівы страхавіты намер ён успамінаў усё радзей, таго вымагалі штодзённыя клопаты. Зноў жа зброі ім усё не давалі, выпрабоўвалі ці што?

Ну і чорт з імі, думаў Ступак, што яму зброя? Ці ён не настраляўся ў Афгане? Ён ужо пачаў думаць, каб яе не давалі як мага даўжэй, хоць бы месяцы два, каб ён параскашаваў на міліцэйскіх харчах, адляжаўся на белых прасьцінах. А то яшчэ і прыдбаў кватэру. На вечаровай бяседзе з асабовым складам палкоўнік сказаў, што афіцэрам дадуць кватэры ці палепшаць старыя — будуецца дом у прэстыжным раёне, блізка ад станцыі метро. Нехта спытаў: дык то ж для творчай інтэлігенцыі, як пісалі ў газетах. На тое палкоўнік адказаў: так, для творчай інтэлігенцыі. Дзесяць кватэр пісьменьнікам, а трыццаць пяць нам. Мы ў большай павазе, чым п'янтосы-пісьменьнікі, якія наскрозь бэнээфаўцы. Што ж, займець сваю кватэру бяз гэтай свалаты Людкі было дужа зманліва, думаў Ступак. Каб яшчэ і прыдбаць іншамарку, такую, як у Шпака. А што, ці ён не заслужыў? Хоць у Афгане.

Па вечарах у чырвоным кутку, як у іх называлася вялікая вуглавая зала, працаваў тэлевізар, перад якім звычайна сядзелі амапаўцы. Збольшага цікавіліся маскоўскімі шоу, сьпевакамі, сьпявачкамі, менш навінамі спорту. Але ў пэўны час тэлевізар пераключалі на мясцовы канал, і тады ўсе сьціхалі, глядзелі і слухалі самога. Ступак слухаў таксама, і надзіва цяпер і выступ, і жэсты, і аблічча самога не выклікала ў яго ранейшага зласьлівага пачуцьця, хіба адно — абыякавасьць. Пра свой ранейшы намер ён стараўся ня думаць, няпэўна казаў сабе ў думках: пабачым. Пажывем, пабачым, як яно будзе.

Неяк у выходны ён рашыў завітаць на сваю хрушчоўку. Трэба было забраць партбілет (сказалі, што будзе добра, калі ён адновіцца ў кампартыі. У якой з дзьвюх — то яго асабістая справа). А галоўнае, яму трэба быў ордэн, які валяўся дзесь у жончынай шафе. Добра, жонкі не было дома, была толькі дачка, яна паказала шафу, што цяпер стаяла ў прыхожай, а ўся гасьцёўня была цесна застаўленая новымі столікамі і крэсламі ад шыкоўнага нямецкага гарнітуру. Дачка без вялікай радасьці ад спатканьня з бацькам пахвалілася, што маці — ужо дырэктар банку. Ступак ціха пазайздросьціў жонцы, — значыць, ня ўсім кепска, ёсьць людзі, якім і цяпер шанцуе. Доўга не затрымліваючыся ў кватэры, ён знайшоў усё, што трэба было, і, выйшаўшы з пад'езду, павярнуў да гаражоў пад ліпамі. Тут яго першым згледзеў сівагаловы Сазон, дужа зьдзівіўся ягонай уніформе. Пазяхаючы бяззубым ротам, усё аглядаў яго з галавы да ног і захапляўся:

— Вот и я когда-то... Такой молодой, подтянутый...

Вылез з-пад свайго "Запарожца" Плешка, стрымана павітаўся.

— Глядзі ты — лейтэнант міліцыі! А нам і не сказаў нічога, усё ў сакрэце. І колькі плаціць?

Ступак яму не адказаў, сапраўды, хай будзе ў сакрэце. Зноў жа, пра тое ён нядаўна даваў падпіску, — ня мог прыпамятаць, каторую за нядоўгі час. Значыць, трэба было маўчаць.

— А дзе Аляксей? — папытаўся ён, згледзеўшы два замкі на жалезных дзьвярах былога суседа.

— Гэ, Аляксей! Аляксей зьехаў, — сказаў Плешка.

— Куды зьехаў?

— Нам не сказаў. У Нямеччыну ці далей. Можа, у Ізраіль.

— Як у Ізраіль? — зьдзівіўся Ступак, — Ён жа беларус.

— Он-то белорус. А вот жена — довольно сомнительных кровей, — туманна растлумачыў Сазон.

Ступак прамаўчаў. Яму было шкада Аляксея, які колісь яго ўратаваў. Каб на паўхвіліны пазьней — яго б ужо не было тут. Ні тут, ні ў АМАПе, падумаў Ступак. І гэтыя дзядкі не дзівіліся б з яго камуфляжу. Зрэшты, можа і добра Аляксею. Каб у яго, Ступака, жонка была не беларуска, ён бы таксама зьехаў. У Ізраіль ці хоць да д'ябла. А так во трапіў на службу, прадаў д'яблу душу.

Але, можа, так яшчэ і лепей.

Таго ж дня ўвечары, толькі ён вярнуўся з гораду, як дзяжурны сказаў, што яго выклікае падпалкоўнік Шпак. Ступак трохі падзівіўся: чаму падпалкоўнік? Нядаўна яшчэ быў маёр, а цяпер падпалкоўнік, ці не наблытаў дзяжурны? Але не наблытаў. У штабе яго сапраўды чакаў колішні калега, у якога цяпер на пагонах блішчэлі дзьве вялікія зоркі, ён засяроджана разглядаў на стале нейкую паперу. Поруч стаялі і яшчэ афіцэры, мабыць, усе вывучалі загад. — Лейтэнант Ступак, загадана забраць рэчы і да штаба. Праз паўгадзіны ад'езд.

— Куды? — вырвалася ў Ступака.

— Да іншага месца службы.

Вось табе і на — ужо і да іншага. Трэба было зьдзівіцца, але Ступак перастаў ужо тут зьдзіўляцца. Афіцэры абступілі Шпака, а ён пайшоў у гасьцініцу, сабраў сваё небагатае майно. Праз паўгадзіны яго ўжо везьлі ў закрытым "Урале" кудысь за горад. У кузаве побач сядзелі яшчэ тры чалавекі — усе з іхняга АМАПу. Але яны былі мала знаёмыя Ступаку, і ён маўчаў. Неўзабаве, аднак, машына спынілася, яны вылезьлі. Вакол у вечаровым прыцемку стаялі высачэзныя хвоі, і пад імі мясьціліся шырокія нізкія будыніны — дачы. То была, як ён здагадаўся, старая ўрадавая рэзідэнцыя, куды іх прывезьлі, каб папоўніць асабістую ахову самога. "Во папаў!" — зноў падзівіўся Ступак, яшчэ ня ведаючы, радавацца з тае нагоды ці засмучацца. Аднак зьнешне ён не выказваў нічога, толькі слухаў і выконваў усё, што загадвалі, ішоў, куды вялі. Зноў былі анкеты, падпіскі, нават подпіс строгай таемнай прысягі. Усё тое ён рабіў, бы машынальна, бы які бязвольны зомбі; свой даўні намер засунуў углыб памяці і нават трохі трывожыўся, каб яго не заўважылі.

Праз дзён колькі, аднак, давялося парадавацца, як іх тут узбройвалі, чаго ён не дачакаўся ў АМАПе. І не якімі хвалёнымі качэргамі АК, што адбівалі плячо пры стральбе і нямала заміналі на маршы, а новенькімі карацелькамі "Узі". Дужа спрытныя выдаліся аўтамацікі, бы самі прасіліся ў рукі і зусім не заміналі — хоць на плячы, хоць на грудзях. Б'юць, казалі, за дваццаць крокаў у вераб'я пры нулявым расьсейваньні. Ступак старанна выцер з варанёнага металу лішак негустой змазкі, рукамі паважыў у сабраным стане. Ён быў задаволены. Можа, спатрэбіцца.

Клопату ў гэтым бары было, аднак, няшмат, некаторыя групамі кудысь езьдзілі, вярталіся і маўчалі.

Паліт-апрацоўка, як заўважыў Ступак, вялася ў інтэнсіўным тэмпе, рэгулярна, калектыўна і індывідуальна. Удзень і асабліва ўвечары заўжды па адным кудысь выклікалі, штось высьвятлялі, з іншымі доўга гутарылі. Так старанна не апрацоўвалі нават нампаліты ў войску. Ну, але тут было ня войска і нават не АМАП. Бяры вышэй. Яны — эліта бясьпекі, як сказаў новы палкоўнік, самыя з самых. Асабістая ахова. Хаця таго, каго ім належала ахоўваць і абараняць "вплоть до пожертвования собственной жизнью", яны нават ня бачылі. Ні зблізку, ні здаля. Адчувалі, што ён недзе тут побач, у гэтых дамоўках-дачах між хвояў, але дзе канкрэтна — ня ведаў ніхто. І ніхто пра тое ні ў каго не пытаўся, — было забаронена. Наогул гэта было падразьдзяленьне маўчуноў. Яны маўчалі з начальствам, маўчалі ў страі, маўчалі ў сталоўцы і на адпачынку. Тое маўчаньне часам пачынала прыгнятаць, але Ступак думаў: хай! Ужо ён чагось дачакаецца. Кепска, што не было як выпіць. Пры тым, што грошай ужо набралася поўныя кішэні, некалькі пачак "зайцоў" ён пакінуў у тумбачцы, захінуў газетай. І ніхто іх ня ўкраў. Мусіць, грошай у іх хапала. Затое не хапала часу, каб іх рэалізаваць, ізаляцыя была адмысловай. Бы ў турме. Мабыць, то была ізняя плата за сыты дабрабыт і няпыльную працу. Плата воляй. Але што зробіш — на гэтым сьвеце за ўсё трэба плаціць. Заплаціць і ён.

Аднойчы ўранку іх пастроілі ў спортзале, усіх чалавек трыццаць, што складалі цяпер ядро групы "Альфа", як іх ужо назвалі. Казалі, што пакуль трыццаць, але будзе трыста, бо трэба мацаваць шчыт і меч кіраўніка дзяржавы. На тым пастраеньні з самага пачатку былі ці ня ўсе іхнія начальнікі разам з галоўным палкоўнікам — мажным бугаём, што зьверху форменнага кіцеля насіў скураное паліто — дзеля маскіроўкі. Зрэшты, так тут хадзіў не адзін ён, а і яшчэ некаторыя, таксама маскіраваліся ці што? Яны можа, з гадзіну прастаялі ў страі, начальнікі ўсё аглядалі выпраўку і падкаўнерыкі, і чысьціню абутку, і ці ўсе добра паголеныя. Ніхто не казаў нічога, але яны пачалі здагадвацца, ці не зьявіцца да іх сам?

І сапраўды — тоўсты грымнуў каманду, і з галоўнага ўваходу зьявіўся ён. На той раз ён таксама быў у камуфляжы, новенькім, акуратным, які добра дапасаваўся да яго рослай спартыўнай постаці. Нягучным, нейкім цеплаватым, амаль хатнім голасам ён дазволіў "вольна" і падышоў да правага флангу, дзе стаялі самыя даўгалыгія, фізічна найболей накачаныя хлопцы, пачаў з усімі вітацца за руку. То было штосьці новае, — каб вялікі начальнік вітаўся з кожным у страі паасобку. Яны ўсе, бы зачараваныя, утрапёна ўзіраліся ў ягоны хітраватаўсьмешысты твар, у якім цяпер не было і сьледу ад яго нядаўняй тэлевізійнай суровасьці — была толькі цеплыня і спагада. Калі чарга дайшла да Ступака, здалося: ён з нейкім асаблівым пачуцьцём зірнуў у Ступакаовы вочы, быццам пранікаючы ў самую глыб душы. Поціск рукі быў дужы, Ступак адказаў такім жа, і адчуў, што ён задаволены. Парукаліся, як мае быць, — памужчынску. Па-вайсковаму. Бо цяпер абодва былі вайскоўцы, хоць той і паходзіў з міліцыянтаў. Ды цяпер ужо і Ступак таксама.

(Заканчэнне у наступным нумары.)

Звоните, и вам ответят

Подскажите, пожалуйста, телефоны "горячей линии" по проблемам здравоохранения в Минске.

С.С.Рубан, г.Минск

Если 9 марта с 9.00 до 17.30 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) вы позвоните по номеру 222-70-80, то сможете побеседовать с главным врачом 17-й городской поликлиники Сергем Сорокиным.

Впрочем, со своими проблемами и пожеланиями минчане могут обратиться и на "горячую телефонную линию" Комитета по здравоохранению Мингорисполкома. Она работает ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 9.30 до 17.30 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по номеру 285-00-10.

РЕЗОНАНС

Помогите рабочим снять ярмо...

Прочитал в газете "Народная воля" статью Александра Бухвостова под названием "Отменим принудительные контракты" и не могу поверить автору, что у рабочего класса нет возможности защитить себя от произвола чиновников. Получается, что кучка начальников и начальничков от власти держит в страхе более чем 9-миллионный народ. Своим хамским обращением они превращают людей труда в быдло, рабочий скот.

С одной стороны, встает вопрос: кто дал право чиновнику так обращаться с простым человеком? С другой стороны: что же это за народ, который не может защитить свои права и достоинство?

Автор пишет, что рабочий человек принудительно поставлен на предприятиях в невыносимые условия. Что диктатура, созданная Лукашенко, рассматривает работника как "рабочее мясо". На рабочем месте за ним наблюдает и контролирует его мастер, начальник цеха, заместитель директора по идеологии и профсоюзный функционер, и все они действуют заодно, все против рабочего.

Что же тогда случилось у нас? Как видно, сегодня не существует единого рабочего движения, объединяющего в своих рядах большинство трудоспособного населения. Рабочий класс распадается на отдельные слои и не способен вести борьбу за свои права. Возникает вопрос: а что же делают профсоюзы? Ничего не делают. Влияние и авторитет их нулевые. А где тогда различные формы протеста рабочего класса? В этой связи возникают все новые вопросы.

Думаю, что одной из основных причин массового разочарования рабочих являются неучастие в новых политических процессах. Они подвергают сомнению различные политические лозунги и призывы.

В этих условиях одной из важнейших задач политиков должна стать защита экономических интересов рабочих. Но где сегодня мы видим всплеск движения против принудительных контрактов? Нигде. А ведь события 29 мая 1999 года, 19—22 августа 1991 года стали неожиданностью для государственных и партийных структур нашей республики. В то время к резкой активизации рабочих оказались не готовы органы власти. Власть была в растерянности. И это неслучайно, потому что тогда были высоки влияние и авторитет профсоюзов. На многих предприятиях создавались забастовочные комитеты, и люди доверяли им.

Если и дальше влияние политических структур в рабочей среде будет падать, то это может поставить под угрозу хрупкие демократические завоевания и усилит административный беспредел власти. Кстати этот беспредел уже давно существует. А рабочий класс не может навести порядок. Поэтому сегодня политические силы Беларуси должны выступить регулятором экономической эффективности и социальной справедливости в каждом конкретном рабочем коллективе. Но для этого требуется новое осмысление своей роли, новая тактика и стратегия действий при резко изменившихся условиях. Главное здесь — разработка долгосрочной стратегии в отношении рабочего движения. Она должна быть основана на происходящих в рабочих коллективах процессах. Рабочий класс не должен терпеть те невыносимые условия, в которые поставила его нынешняя власть. Разве может средний рабочий не есть, не пить 30 лет, чтобы получить квартиру? Здесь о силе рабочего класса говорить не приходится. Слабость, неорганизованность рабочих очевидна.

Я поддерживаю А.Бухвостова по поводу создания инициативной группы для внесения изменений в действующее законодательство об отмене принудительных контрактов. Рабочему классу нужно смелее выходить на политическую арену, а не замыкаться только в своей профсоюзной скорлупе. Для улучшения своего положения перед властью нужно ставить не только экономические, но и политические вопросы и добиваться их выполнения. Иначе удачи не видать.

Александр ЗАРЕНОК, житель д.Сирод Калинковичского района.

ЖИЗНЬ КАК ОНА ЕСТЬ

Вокзал преткновения

Пятнадцать лет в Журбине ждут, когда чиновники Белорусской железной дороги выполнят свое обещание. В 1992 году власти заверяли, что отремонтируют здание вокзала за несколько месяцев...

Взрослые и дети стояли на перроне остановочного пункта "Журбин" Костюковичского района Могилевской области в ожидании прибытия дизель-поезда и не знали, куда спрятаться от мороза и разгулявшегося ветра. Укрыться от непогоды под "крылом" небольшого навеса все желающие не могли. Чтобы не замерзнуть окончательно, люди притопывали и прихлопывали.

Мужчина в осенней куртке и спортивной шапочке пустился вприсядку, похлопывая руками по плечам. Людей это развеселило, посыпались шуточки. "Приехал к матери в отпуск во время потепления, а к отъезду вот неожиданно похолодало", — он не то оправдывался, не то объяснял, почему одет не по сезону.

Молодой папа проблему холода решал по-другому — устроил для себя и своего пятилетнего сынишки кросс на короткую дистанцию: от столба до столба. Малыш несколько раз падал, а папа, помогая ему подняться на ножки, пояснял: "Ничего, сынок, зато не простудишься!.. Ну, давай еще побегаем!" Малыш соглашался, и забег повторялся снова и снова.

Одетый по-зимнему старик, наблюдая за "спортсменами" вздохнул, а потом глухо произнес: "Ох, до чего дожили! Разве можно так над людьми издеваться, кто дал такое право!" И, повернув голову к присутствующим, спросил: "Неужели так и не откроют вокзал?"

Присутствующие загудели, закричали, замахали руками. Словно ждали, кто первый вслух заговорит о наболевшем. Вокзал в Журбине когда-то был. Старое заброшенное здание стоит на перроне и сегодня. Только окна заложены кирпичом, а дыры в дверях залатаны досками...

То, что произошло в 1992 году, жители деревень Журбин, Селецкое, Алексеевка, Азоевка, Плоское, Смольки, Разрытое (перечень можно продолжать и продолжать) — до сих пор не могут спокойно вспоминать. Замечу, в д.Селецкое построен городок для переселенцев из чернобыльской зоны, и с конца 90-х годов прошлого века население поселка увеличилось вдвое, а то и втрое. Тогда, в 1992 году, по неизвестным причинам без всякого объяснения вокзал на станции Журбин был закрыт. Сначала местные жители думали, даже были уверены, что это временно, потому что на вокзале всегда много народа. Но шло время, а замок по-прежнему висел на дверях здания. Когда стало понятно, что никто и не собирается открывать здание вокзала, жители стали писать письма руководству Белорусской железной дороги.

Так здание вокзала выглядит в настоящее время.

Ответ за подписью заместителя начальника пассажирской службы Ю.Г.Редько от 27.05.1992 года пришел незамедлительно. Виновные были указаны, обещания открыть вокзал в ближайшие сроки даны. *"Закрытие вокзала станции Журбин произошло по вине руководителей Могилевского отделения, для которых интересы пассажиров, к сожалению, не имели никакого значения,* — говорилось в официальном документе. — *Управление дороги сделало необходимые выводы и сообщает, что не позднее 10 июня вокзал будет открыт для пассажиров".*

На этом все и остановилось... Сегодня в Беларуси новая власть, которая уже 12 лет декларирует заботу о белорусском народе. Справедливости ради надо сказать, что где-то старые здания вокзалов и ремонтируются. Молодечно, Вилейка, Шклов... Но почему-то не доходят руки властей до поселка Журбин.

А ведь когда-то, в далеком 1918 году, была построена линия Журбин—Костюковичи (ныне Коммунары) протяженностью 33 километра (из "Истории Белорусской железной дороги" (1871—2001 гг.). В ее строительстве, по рассказам людей, были задействованы жители близлежащих деревень — мужчины и женщины, старики и дети, которые, охваченные порывом энтузиазма, носили в ведрах, корзинах и фартуках камушки, укладывали их между рельсами. Они, не побоюсь этого слова, внесли свой личный вклад в развитие железной дороги. Делали все для того, чтобы лучшей была жизнь и для них, и для будущих поколений, потому что понимали: "железка" — это не только связь с внешним миром, но это и быстро, и удобно. День пуска поезда на этом участке был всеобщим праздником!

Потом на станции появился первый вокзал — небольшой, деревянный. В 1976 году на его месте было построено современное кирпичное здание с просторным залом ожидания. На скамейках можно было посидеть, отдохнуть после дальней дороги, а в кассе — приобрести билеты в нужном направлении. Во дворе станции стоял колодец, ключевая вода которого "возвращала к жизни" любого, особенно в жаркую погоду. А в магазине, расположенном рядом, можно было приобрести продукты, их ассортимент всегда, даже в часы дефицита, удивлял своим разнообразием. Многие жители окрестных деревень специально ездили сюда за продуктами.

В общем, все было цивилизованно, как и должно быть в нормальном государстве, пока кто-то одним взмахом волшебной палочки не поставил крест на том, что создавалось годами. Закрыли здание вокзала. Потом и второй железнодорожный путь, из-за чего впоследствии возникли новые проблемы...

В настоящее время маршрут пассажирского поезда №392/391 Гродно—Унеча в связи со снижением пассажиропотока в зимний период укоротили: до Журбина поезд не доходит, конечный пункт — Белынковичи. Но добраться пешком до Белынкович жителям окрестных деревень ох как нелегко — 20 километров что-то значат, особенно для пожилых людей. Тем более в непогодь. В общем, назначение поезда до соседней станции местные жители расценили как издевательство над ними. Кажется, поезд стоит совсем близко, а на самом деле — далеко!

В 2008 году исполнится ровно девяносто лет, как появилась железнодорожная станция Журбин! Хочется верить, что до этого времени вопрос открытия вокзала будет решен, и юбилей местные жители будут отмечать в отремонтированном здании. Примечательно еще и то, что остановочный пункт "Журбин" расположен на стыке двух государств, в нескольких километрах от Суражского района Брянской области Российской Федерации. Именно здание вокзала, имей оно привлекательный вид, могло бы стать достойной визитной карточкой Беларуси... Жители окрестных деревень очень верят в торжество справедливости...

Надежда МИЦУК.

Минск.

Адвоката Козулина обвиняют в получении взятки?

В Республиканскую коллегию адвокатов из Главного управления предварительного расследования МВД поступило письмо с просьбой дать оценку деятельности адвоката Игоря Рынкевича. Защитник Александра Козулина не исключает, что готовится почва для возбуждения в отношении него очередного дисциплинарного производства. Два взыскания у Рынкевича уже есть. Если юрист получит третье, то лишится адвокатской лицензии.

— Суть письма такова: якобы я нарушил правила профессиональной этики, — говорит Игорь Рынкевич. — Была проверена моя адвокатская деятельность за период с 1999-го по 2003 год. Якобы всплыл какой-то эпизод, когда я был защитником по уголовному делу, но выступал в процессе в качестве свидетеля, чего не имел права делать. Более того, нашелся гражданин, который заявил, что якобы в 2003 году он передал мне 50 долларов в рамках оплаты моих адвокатских услуг. Но почему не 2 тысячи долларов?..

Кому-то неймется найти в моей адвокатской деятельности нарушения правил профессиональной деятельности, чтобы вынести мне третье дисциплинарное взыскание и лишить адвокатской лицензии. Складывается впечатление, что проверяют всю мою адвокатскую деятельность, несмотря на то, что сроки реагирования уже давно прошли.

Я готов дискутировать с органами. Но они пытаются руками адвокатского самоуправления, руками моих коллег решить мою судьбу.

Естественно, что все эти обвинения в нарушении профессиональной этики, которые якобы я допустил, я опроверг. Я законопослушный гражданин.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ЗАКУЛІССЕ

Аляксандр Прохараў дачакаўся сваёй «зорнай гадзіны»?

Магчыма, менавіта ён стане аўтарам першага ў Беларусі коннага помніка

Конкурс на помнік князю Усяславу Чарадзею для Полацка прайшоў у два этапы. Першы тур муніцыпальны. Ён выявіў тры найбольш удалыя, на думку кіраўніцтва горада, праекты. У другім, які адбыўся напрыканцы лютага, вызначыўся лепшы з трох. Перамогу прысудзілі аўтарскаму калектыву, у які ўваходзяць скульптары Аляксандр Прохараў, Сяргей Ігнацьеў і Леанід Мінкевіч.

Другое і трэцяе месца за Аляксандрам Шатэрнікам і Сяргеем Бандарэнкам. Помнік запланавана адкрыць 8 верасня бягучага года, калі ў горадзе адбудуцца мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню 1145-х угодкаў заснавання першай сталіцы Беларускай дзяржавы.

З трох скульптараў — пераможцаў конкурсу найбольш вядомы Аляксандр Прохараў. Ён скончыў нашу мастацкую акадэмію ў 1999 годзе. Дыпломны праект Прохарава — памятны знак бітве на Нямізе — зацікавіў кіраўніцтва сталіцы. Але на рэалізацыю праекта ў гарадской казне не знайшлося грошай. За апошнія восем год у Беларусі не было скульптурнага конкурсу (за выключэннем, бадай, конкурсу на помнік савецкім пагранічнікам у Гродне), у якім бы Аляксандр не браў удзелу. Два гады таму ён у складзе аўтарскага калектыву ўзяў Гран-пры на Міжнародным (СНД) архітэктурным конкурсе "Леанарда-2005" за праект мемарыяльнага комплексу на месцы лагера смерці Трасцянец. Прохараў — аўтар помніка Кірылу Тураўскаму, што стаіць у двары Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Скульптар кажа, што над вобразам Усяслава ён працуе яшчэ з 1995 года. Таму ўдзел у полацкім конкурсе для яго не выпадковасць, а цалкам заканамерная падзея.

Аляксандр Фінскі (аўтар помнікаў Сімяону Полацкаму ў Полацку і Адаму Міцкевічу ў Мінску), чыё слова было не апошнім пры вызначэнні пераможцы конкурсу на помнік Усяславу, лічыць, што ініцыятыву полацкіх улад трэба вітаць. Муніцыпальныя праекты сёння часта маюць больш шансаў здзейсніцца, чым тыя, якія курыруе непасрэдна Міністэрства культуры. Сталічны чыноўнік не любіць рызыкаваць, браць на сябе адказнасць. Яму калі-нікалі зручней імітаваць рабочы працэс, чым рэальна дбаць аб справе. Зрэшты, звярнуўшыся да мясцовага патрыятызму, прасцей наладзіць фінансаванне праекта. З Аляксандрам Фінскім, аднак, наўрад ці пагодзяцца Шатэрнік і Бандарэнка, аўтары адхіленых праектаў. Калі ў гэтай сітуацыі яны надумаюць аспрэчыць вынікі конкурсу і дзеля гэтага афіцыйна звернуцца ў Мінкульт, дык гісторыя можа мець непрадказальны працяг... Дарэчы, праект можна лічыць канчаткова зацверджаным толькі тады, калі на яго рэалізацыю выдаткаваныя грошы. А гэтае пытанне яшчэ вырашаецца.

Скульптуры Аляксандра Прохарава і ягоных сяброў я не бачыў, таму і меркавання пра яе не маю. Адно скажу: месца для першага ў Беларусі коннага помніка вызначана не вельмі ўдала. Усяслаў варты таго, каб ягоны помнік стаяў не сярод безаблічнай забудовы спальнага раёна, а непадалёк ад Сафійскага сабору. Як, дарэчы, прапануе Аляксандр Шатэрнік.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 САКАВІКА 2007 г.

СВЕЦКАЯ ХРОНІКА

Кавалёў нікому не адмаўляе

Новы дыск песень "Кропка.by" прэзентаваў на мінулым тыдні Сяргей Кавалёў — практыкуючы ўрач ультрагукавой дыягностыкі, спявак і кампазітар.

Гэта першы альбом Кавалёва, які зроблены *"падаросламу"*, — з прадзюсінгам, з прэс-канферэнцыяй і нават з банкетам... Дарэчы, прэзентацыя дыска адбылася ў дзень нараджэння Сяргея. Яму споўнілася сёлета 45 год і гэтую дату, па ўласным прызнанні, ён адзначыў *"у ціхіх утульных абставінах з самымі блізкімі людзьмі"*.

На дыску запісаны апошнія песні, аднак самая позняя з іх напісана ў 2005 годзе (*"Дождись"*). На працягу апошніх паўтара года ў спевака назіраецца *"творчы крызіс"*.

"Сёння ў мяне проста няма ўнутранага позву, — тлумачыць Кавалёў. — *Паколькі чалавек я дарослы, для таго каб нешта рабіць, мне трэба ведаць, што гэта камусьці патрэбна. Я не цешу сваё эга, я пішу песні для людзей. І часам узнікае сумнеў, ці патрэбны мае песні яшчэ камусьці. Але ў гэты дзень нараджэння я некалькі разоў пачуў: "Мы чакаем новых песень". Таму я сур'ёзна задумваюся над тым, каб зрабіць нешта яшчэ..."*

Сяргей таксама прызнаўся, што паўтарагадовае *"зацішша"* ў творчасці звязана і з пэўнымі праблемамі асабістага характару. *"Для гэтага дыска шмат у маім асабістым жыцці было пакладзена на алтар"*, — заўважыў Кавалёў. Больш распавесці пра гэта ён адмовіўся. Аднак прызнаўся, што лічыць сябе дрэнным бацькам.

Дарэчы, Сяргей неаднаразова быў жанаты і мае дваіх дзяцей: *"Мая прысутнасць у іх жыцці азначаная, але я лічу, што мог бы рабіць значна больш для маіх дзяцей"*.

На дадзены момант Сяргей Кавалёў не жанаты, але і яго *"сэрца не свабоднае"*.

Затое Сяргей Кавалёў як урач вельмі важны для чужых дзяцей. Шматлікія "зорныя мамы" ўдзячны яму за тое, што менавіта ён развеяў сумневы наконт здароўя іх будучых дзяцей падчас цяжарнасці. Таму на прэзентацыі дыска "Кропка.by" з Днём нараджэння спевака і ўрача віншавалі **Ларыса Грыбалёва** і **Тамара Лісіцкая.**

Між іншым, каб патрапіць на прыём да Сяргея Кавалёва, не абавязкова быць зоркай ці яго добрай знаёмай.

"У нашай сёмай бальніцы нават ходзіць паказка, што Кавалёў нікому не адмаўляе!" — запэўнівае Сяргей і ўдакладняе: *"У сэнсе аказання дапамогі, зразумела"*.

Вальжына КОРСАК.
Фота аўтара.

КОРАТКА

Дэбют Шчамялёва

У Нацыянальным мастацкім музеі днямі пачала працаваць выстава народнага мастака Беларусі **Леаніда Шчамялёва** *"Мастак і час"*.

Нягледзячы на тое, што Шчамялёў выстаўляўся амаль кожны год, у Нацыянальным музеі ён прэзентуе свае творы ўпершыню.

Колькі заплацяць Мірэй Мацье і Тота Кутунья?

Чыноўнікі ад культуры ўжо праанансавалі прыезд на "Славянскі базар" **Мірэй Мацье** і **Тота Кутунья.** "Народная воля" пацікавілася ў Міністэрстве культуры, якія ганарары запатрабавалі вядомыя спевакі за ўдзел у "Базары".

"Зараз якраз ідзе абмеркаванне кантрактаў, бо акрамя ганараараў яны выставілі даволі вялікі і складаны спіс патрабаванняў, — паведамілі нам адказныя асобы міністэрства. — *Напрыклад, на цягніках яны не ездзяць... Але кантракты пакуль што не падпісаны. Канчатковы вынік перамоў стане вядомы прыблізна ў красавіку, тады можна будзе казаць і пра ганарары"*.

Амаль версальскія туалеты

нядаўна з'явіліся ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

Пра гэта на сустрэчы з журналістамі паведаміла намеснік дырэктара па навуковай працы музея **Надзея Вусава**.

Паводле яе слоў, напярэдадні адкрыцця новай прыбудовы да музея ў старым будынку нарэшце адрамантавалі туалеты.

"У нас цяпер туалеты — проста Версаль! — сказала Надзея Міхайлаўна. — *Музей пачынаецца з вешалкі, але трэба звяртаць увагу і на такія рэчы таксама"*.

Зараз музейныя работнікі мараць пра адкрыццё музейнага кафэ.

"Запросім вас туды гадоў праз пяць, — выказала спадзяванне Н.Вусава. — *Але ва ўсялякім выпадку і зараз ужо не сорамна прыйсці ў музей"*.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

СЛЫШАЛИ?

У Михаила Павлова — новый советник

Ольга Барабанщикова снова вернулась в теннис. Правда, несколько в другом амплуа: по решению Белорусской теннисной ассоциации она назначена на должность старшего тренера.

— Такое предложение от теннисной ассоциации было очень неожиданным и даже польстило, — призналась Ольга. — Я рада, что теперь у меня есть возможность быть ближе к тому, что происходит в теннисном мире Беларуси. Признаюсь, я без него скучала. И ностальгия временами долго не отпускала.

Олиным тренерским дебютом стала работа с девичьей сборной (до 14 лет).

— Мы познакомились на сборах за три дня до отборочного турнира на командное первенство Европы, — рассказывает Оля. — Я давала девочкам задания, следила за их работой. На отборочном турнире мы заняли первое место. На финал полетели в Голландию. Там мы проводили на кортах 11 часов ежедневно. Даже я уставала. Теперь только поняла, как тяжело приходится тренерам. Следить за игрой своих учеников на турнирах — это невероятный стресс, переживания, нервы... Девочкам тоже было нелегко. Для создания стимула в работе я организовала поощрительные призы. А для того чтобы они хоть как-то отдыхали после тренировок, по вечерам я возила их в город. Мы провели бок о бок несколько дней — за это время успели узнать и даже привязаться друг к другу. Когда прощались в минском аэропорту, даже как-то грустно стало: сборы закончились, и теперь девочки продолжат работу с личными тренерами.

Кроме должности тренера, Барабанщикова еще является главным советником председателя Мингорисполкома Михаила Павлова по спортивным вопросам, касающихся тенниса.

В дальнейших планах Ольги работа со старшей женской сборной Кубка федерации. Хотя теннисная ассоциация привлекает Ольгу не только к тренерской работе.

— Оля — отличный специалист в области тенниса, один из лучших в нашей стране, — говорит директор теннисной ассоциации **Сергей Лащуев.** — Она замечательно справляется со своей новой должностью. Барабанщикова знает о теннисе не понаслышке. Она профессионал своего дела и может применить свои знания не только в тренерской работе. Мы уже привлекали ее в качестве комментатора на Кубке Дэвиса. Дел много, штат у нас небольшой. Так что должностью тренера Олина работа у нас не ограничится.

Возвращение Ольги Барабанщиковой в спорт никак не скажется ни на музыкальной карьере, ни на карьере телеведущей.

— Сцену и телевидение на теннисный корт я точно не променяю. Буду совмещать спорт, ТВ и музыку. Все это уже стало неотъемлемой частью моей жизни, и без этого я уже не могу! — говорит Ольга.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Калі даўно не плакалі — паглядзіце...

На мінулым тыдні ў Доме кіно адбылася прэм'ера двухсерыйнага беларускага фільма "Рыфмуецца з каханнем". Рэжысёр карціны — былы кіраўнік Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Аляксандр Яфрэмаў.

"У мяне пакуль не ўзнікае жадання апускаць галаву, калі я гляджу гэтае кіно, — гаворыць Яфрэмаў. — *Нельга сказаць, што ўсё я добра зрабіў, што ад мяне залежыла. Але мне здаецца, што нешта атрымалася..."*

Фільм скончылі здымаць яшчэ ў лістападзе мінулага года, але пасля мантажу і агучвання толькі цяпер ён гатовы да прагляду.

"Рыфмуецца з каханнем" прысвечаны ўрачам анкагематалагічнага цэнтра, дзе лечацца дзеці з захворваннямі крыві. Там, дарэчы, і праходзілі здымкі.

У карціне зняліся расійскія акцёры **Ганна Кавальчук** і **Аляксандр Дзьячэнка**, а таксама беларускія зоркі **Марыя Возба, Аксана Лясная, Андрэй Перапечка, Вера Палякова**, жонка рэжысёра **Валерыя Арланава** і іншыя.

Аляксандра Яфрэмава асабліва ўразіў адзін з самых юных акцёраў **Ілля Сіняўскі**, які адмыслова пагаліўся, у знак салідарнасці з дзецьмі, якія знаходзіліся на лячэнні ў дыспансеры, дзе здымалі фільм.

Карціна якасная і цікавая настолькі, наколькі, напэўна, можа быць сучаснае беларускае кіно. Часам можа прымушаць гледача і крыху паплакаць, і пасмяяцца. Цікавыя, напрыклад, чуллівыя эпізоды, узятыя рэжысёрам з рэальнага жыцця пацыентаў цэнтра — калі дзеці, пацярпелыя ад аварыі на ЧАЭС, катаюцца на прыстасаваннях для кропельніцы, як на самакаце, ці танчаць з ім вальс...

Вальжына КОРСАК.

ПОГЛЯД ЗБОКУ

Уладзімір РЫЛАТКА, намеснік міністра культуры Беларусі:

— Калі нехта даўно не плакаў — абавязкова рэкамендую паглядзець. Вельмі добры фільм з бліскучымі жаночымі ролямі...

КИНОВЕСТИ

За восемь лет она ни разу не пожалела, что уехала из Беларуси

В 1999 году наша землячка Элеонора Семенова уехала с мужем в Канаду. Причиной отъезда стала ее профессиональная невостребованность. Талантливого художника по костюмам, с которым работали такие режиссеры, как Валерий Рубинчик, Игорь Добролюбов, Элем Климов, списали с кинематографического борта за ненадобностью.

Первые годы, конечно, было трудно с устройством, но постепенно жизнь супругов в Торонто налаживалась. Спустя восемь лет они имеют собственную большую квартиру в самом престижном районе на улице Янг, купленную в рассрочку на 25 лет (в год оплачивают до 10% от суммы долга и определенный процент банку за кредит). В их многоэтажке жильцы бесплатно пользуются бассейном, сауной, спортзалом. Есть охрана.

Материальное благополучие достигалось благодаря гостеприимству и помощи эмигрантам со стороны властей и благодаря собственному трудолюбию. **Геннадий Новик**, муж Эллы Григорьевны, работает в частной фирме водителем. Сама она по-прежнему отдана художественному творчеству, хотя и немного изменила профессиональный профиль — занимается станковой живописью. Ее картины с изображением незнакомок в стиле декаданса, а также других театрализованных персонажей покупают картинные галереи, заказывают выставочные салоны и частные лица. Не так давно известный российский документалист **Александр Иванкин**, также эмигрировавший в Канаду, предложил ей написать портреты Черчилля и Рузвельта для биографических полнометражных кинолент об этих известных политических деятелях (фильмы показаны по одному из телеканалов России).

Недавно Элла Семенова была в Минске, встречалась с бывшими коллегами-кинематографистами с "Беларусьфильма". По ее словам, за восемь лет она ни разу не пожалела о том, что уехала на другой континент...

ГАСТРОЛЬ

«Детям до и взрослым после»

Так называется танцевальная программа, которую привозит в Беларусь популярный балет Аллы Духовой "Тодес".

С этой программой артисты "Тодеса" побывали уже во многих городах России. И везде — успех.

Программа, которую "Тодес" презентует в Беларуси, готовилась два с половиной года. В ней сочетаются экстравагантные традиции культуры варьете начала XX века и современный танец.

Когда ждать? 23—27 марта.

Сколько стоит билет: от 25 до 100 тысяч рублей в Минске, и от 25 до 45 тысяч в других городах Беларуси.

Ольга ПРУДНИКОВА.

Ноч полацкіх ваўкалакаў

Прэзентацыя першага альбома рок-гурта "Indra" прайшла ў мінулую нядзелю ў Полацку. Імпрэза ўяўляла сабой канцэрт з дзіўнай назвай "Ноч ваўкалака" працягласцю ў тры гадзіны з удзелам сяброў "Indra" — полацкіх і наваполацкіх гуртоў.

Нагадаем, гурту "Indra" ўсяго чатыры гады. Але ў студзені гэтага года музыкі як пераможцы конкурсу "Зваротны адлік-2006" Еўрапейскага радыё для Беларусі атрымалі магчымасць бясплатнага запісу альбома. Дыск з пазітыўнай назвай "Сонца вакол" палачане запісалі ўсяго за пяць з паловай дзён. Але вынікі сваёй працы яны змаглі пачуць толькі на гэтым тыдні — першую партыю дыскаў у колькасці 72 экземпляры ім прывезлі адразу на канцэрт.

Прадзюсерам альбома быў **Вячаслаў Корань** ("Ulis"). Падчас працы ў студыі яны з гуртом пасябравалі, таму "Ulis" стаў адным з жаданых гасцей на прэзентацыі альбома. Цікава, што гэта было першае выступленне легендарнага гурта ў Полацку. Ды і наогул, "Ulis" апошнім часам амаль немагчыма пачуць ужывую.

"Тое, што мы даўно не выступалі ў Беларусі, звязана з агульнымі праблемамі: усе беларускія рок-гурты фактычна не маюць магчымасці выступаць на вялікіх канцэртных пляцоўках, — тлумачыць Вячаслаў Корань. — *Усіх загналі ў маленькія клубы, а клубы — прэрагатыва гуртоў-пачаткоўцаў"*.

Затое ўдзельнікі мінскага "гурта-пачаткоўца" "Рэха" даволі часта апошнім часам радуюць сваімі выступленнямі. І канцэрт у Полацку ім таксама спадабаўся: *"Як заўсёды, чым далей ад Мінска, тым публіка больш ахвочая і галодная да музыкі"*.

Кацярына АНДРЭЙЧАНКА.

ВІНШУЕМ!

Кветкі і воплескі патрыярху сцэны

Неверагодна, але факт: у дзень святкавання свайго 90-годдзя выйшаў на сцэну ў новай ролі старэйшы з акцёраў Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Я.Коласа, народны артыст Беларусі і СССР Фёдар Шмакаў.

Звязаўшы свой лёс у мастацтве з віцебскай сцэнай у 1941 годзе, Шмакаў вярнуўся ў горад пасля яго вызвалення ад ворага і адразу ж стаў зоркай славутай коласаўскай трупы, скарыўшы сваім талентам сэрцы нават самых прыдзірлівых гледачоў, якія выхоўваліся на лепшых узорах.

Народжаны *29 лютага*, якое здараецца аднойчы за 4 гады, Фёдар Іванавіч мусіў святкаваць свой юбілей у іншы дзень — *1 сакавіка.*

Гледачы, якія набылі білеты на вечаровы спектакль у гэты дзень, не толькі ўбачылі юбіляра ў выдатнай пастаноўцы, але і сталі ўдзельнікамі бенефісу Ф.Шмакава з нагоды ягонага 90-годдзя. Воплескі за цудоўнае выкананне ролі і за таленавітую рэжысуру натуральна пераралі ў авацыі і віншаванні чалавеку, які аддаў тэатру ўсё жыццё.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЮБІЛЕЙ

Люся Лушчык сыходзіць на АНТ?

Днямі "Першы музычны канал" адзначыў свой 5-гадовы юбілей.

Урачыстасці распачаліся ў сталічным казіно "Міленіум".

Гендырэктар канала **Валерый Краўчук** прыйшоў на юбілей са сваім маленькім сабачкам. Ці то падкрэсліваючы, што юбілей каналу прыйшоўся менавіта на год сабакі, ці то таму, што проста не расстаецца са сваім любімцам ні на секунду. Так ці іначай чацвёраногі сябра Краўчука быў у цэнтры ўвагі, ён ні разу не падаў голасу, больш за тое, не адмовіў ніводнаму фотакарэспандэнту ў фотасесіі...

Паводле слоў Краўчука, "Першы музычны" арыентуецца на расійскія музычныя каналы, *"таму ў Беларусі ў нас амаль няма канкурэнцыі"*.

Большасць артыстаў лічаць за гонар ратацыю ў эфіры "Першага музычнага".

"На недахоп у музычным матэрыяле канал не пакутуе, — гаворыць Краўчук. — *Іншая справа, якой якасці гэты матэрыял. Да нас амаль кожны дзень прыходзяць маладыя спевакі, якія знялі ў суседнім двары, як ім здаецца, якасны кліп... Але гэта не заўжды так. Каб зняць добры кліп, патрэбны добрыя грошы. Гэта закон бізнесу"*.

Праўда, беларускі шоу-бізнес ужо колькі год запар знаходзіцца ў стане бясконцага станаўлення. Нават славуты сямідзесяціпрацэнтны закон дапамог не моцна. Бо артыстаў, на якіх ходзяць непрымусова, а па закліку сэрца, артыстаў, якія збіраюць аншлагі, не набярэцца і дзесяці чалавек...

Павіншаваць "Першы музычны" прыйшлі **Паліна Смолава, Ганна Шаркунова**, праект **"Антыбіётык"** і іншыя.

У "Міленіуме" былі заўважаны далёка не ўсе ві-джэі "Першага музычнага". Адсутнічала Каця Пытлева, якая рыхтавалася да вялікага канцэрта з нагоды юбілею канала. Не было і **Люсі Лушчык** — удзельніцы праекта "Зорны цырк" на АНТ". Дарэчы, Валерый Краўчук абверг чуткі аб тым, што Лушчык спрабуе перайсці на АНТ.

"Гэта чуткі. Яна б і сёння з намі была, аднак у цырку запіс чарговай перадачы..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ПОСТФАКТУМ

«Паглыбленне» напалову

На мінулым тыдні ў Палацы Рэспублікі адбыўся вялікі канцэрт групы "Піт Паф". Гледачоў прыйшло няшмат — зала была запоўнена ледзь напалову.

Насамрэч, знайсці 11—15 тысяч рублёў, каб схадзіць на канцэрт, мог бы нават самы галодны студэнт. Значна даражэй абышоўся б візіт у начны клуб або на канцэрт, напрыклад, **Зміцера Вайцюшкевіча**. Дый дыск "Паглыбленне" каштуе не танней за 20 тысяч беларускіх рублёў.

Як прызнаўся **Піт Паўлаў**, прэзентацыю альбома "Паглыбленне" ён збіраўся зладзіць ужо каля года. І ўрэшце напрыканцы лютага *"ўсе перашкоды былі зламаныя — апошняй сталася тое, што не набываліся квіткі"*.

І сапраўды, рэкламы канцэрта амаль не было, а квіткі можна было набыць толькі ў касах Палаца Рэспублікі.

Яшчэ адной з магчымых прычын такой нізкай наведвальнасці канцэрта Піт назваў месца яго правядзення — маўляў, у некаторых чамусьці існуе пэўны недавер да гэтай канцэртнай пляцоўкі. Аднак Піт Паўлаў сказаў, што будзе шукаць магчымасць ладзіць наступныя канцэрты менавіта на малой сцэне Палаца Рэспублікі: *"Тут самая лепшая акустыка залы плюс апаратура. І мікрафонаў хапае. Карацей, створаны ўсе ўмовы для артыста"*.

Андрусь ЛЯСКО.

Преступление в подъезде московского дома

В этом году в Москве совершена попытка убийства кинопродюсера, дистрибьютера, генерального директора государственного унитарного предприятия (ГУП) "Московское кино" Анны Пендраковской.

Киллеров было двое, они поджидали ее в подъезде и, когда женщина появилась, нанесли ножевые ранения в область сердца.

Несколько недель Анна Васильевна находилась в реанимации под охраной милиции. По информации моего московского коллеги, последние сведения о ее здоровье таковы: она чудом выжила, и ее вот-вот должны выписать домой.

Анна Пендраковская — человек известный и среди кинопрокатчиков, и среди кинематографистов. В 1993 году она приезжала в Минск, будучи главой продюсерской кинофирмы "Василиса", вокруг которой концентрировались люди, желавшие работать на рынке кино честно и открыто, без финансовых манипуляций. В минувшем году она также была в нашей столице — делилась опытом деятельности московской киносети в условиях свободной конкуренции.

Тревожные сигналы от москвичей-прокатчиков стали доноситься с 2004 года — после того как городские власти столицы приняли решение об объединении 53 кинотеатров (из 91) под единым началом для упорядочения кинопоказа и доходов от него. Интеграционный процесс шел (и идет) с большим сопротивлением корпоративных групп и частных лиц, заинтересованных в кинобизнесе. Некоторые киноточки Пендраковская брала, что называется, с боем: вызывала вооруженные отряды милиции. Ситуация обострилась после того, как Департамент экономической политики и развития Москвы наметил меры по ускорению объединения объявленных кинотеатров.

ГУВД Москвы продолжает расследование преступления. Коллеги Анны Пендраковской и ее муж, режиссер Валерий Пендраковский, не сомневаются в том, что нападение стало результатом ее решительных служебных действий.

Алла БОБКОВА,
кинокритик.

Народная Воля http://www.nv-online.info
9 САКАВІКА 2007 г.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Медаль насуперак жаданню...

Гэтай сенсацыі мы чакалі амаль сорак гадоў. І вось яна адбылася.

На беларускім спартыўным небасхіле ўспыхнула новая зорка. Раней імя дзевятнаццацігадовага беларускага лыжніка Леаніда Карніенкі было вядома толькі спецыялістам і сапернікам. Усё перамянілася пасля яго сенсацыйнага поспеху на нядаўнім чэмпіянаце свету па лыжных гонках. На спаборніцтвах у японскім Сапара Леанід Карніенка заваяваў сярэбраны медаль. Апошнім разам беларускія лыжнікі (а дакладней — лыжніцы) былі з медалямі ажно ў 70-х гадах мінулага стагоддзя. На чэмпіянаце свету ў нарвежскім Осла ўраджэнка Магілёва Рыта Ачкіна ў складзе зборнай СССР перамагла ў эстафеце. Дзвюма гадамі пазней на зімовай Алімпіядзе Ачкіна паўтарыла свой поспех. Аднак у тыя часы глыбінка, як правіла, працавала на сталіцу СССР. Ачкіну прыкмецілі хутка, і спартсменка пераехала ў Маскву.

Гучных імён у гісторыі сувярэннага лыжнага спорту Беларусі, акрамя, бадай што, Сяргея Далідовіча, і не назавеш. Аднак у апошні час гэтага спартсмена праследуюць праблемы з павышаным узроўнем гемаглабіну ў крыві. Першы трывожны званочак прагучаў на Алімпіядзе ў Турыне, калі Далідовіча наогул былі вымушаны адправіць дамоў, у беларускую сталіцу. Гісторыя з абсалютнай дакладнасцю паўтарылася і падчас чэмпіянату свету. Пра медаль можна было б і не марыць. Але ў складзе нашай зборнай аказаўся Леанід Карніенка. Мала хто ведае, што сам спартсмен не хацеў ехаць у Японію. Ён збіраўся засяродзіцца на падрыхтоўцы да юніёрскага першынства планеты. Аднак на прысутнасці Карніенкі ў кампаніі "дарослых" настаяў галоўны трэнер нашай зборнай Вадзім Сашурын. І ён не памыліўся! Дзевятнаццацігадовы Карніенка прывез з Японіі першы ў сваёй спартыўнай кар'еры "дарослы" медаль. Дагэтуль у спартыўнай біяграфіі Леаніда была бронза на алімпійскім фестывалі моладзі Еўропы ў 2005 годзе.

Сваю спартыўную кар'еру малады магілёўскі лыжнік Леанід Карніенка распачынаў у дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе ў Клімавічах. Першымі яго трэнерамі былі Віктар і Ала Шапоравы. Спецыялісты ўзгадваюць, што Карніенка прыйшоў да іх, калі вучыўся ў трэцім класе. Характар у хлопца быў, што называецца, не падарунак — Лёня мог успыхнуць, як запалка, але вельмі хутка адыходзіў. Дарэчы, з самага дзяцінства Лёня Карніенка падабаўся дзяўчатам. У Клімавічах, як і ў многіх іншых маленькіх гарадках нашай краіны, дзецям і падацца асабліва няма куды. Спорт — адно ўратаванне. Напэўна разумела гэта і маці сярэбранага прызёра чэмпіянату свету Тамара Леанідаўна. Спартсмен рос без бацькі. Ёй было цяжка гадаваць дваіх дзяцей — у Леаніда Карніенкі яшчэ ёсць сястра, якая працуе выхавацелькай у дзіцячым садку.

Мала хто здагадваецца і пра тое, што ў спартыўным жыцці Леаніда Карніенкі не ўсё было гладка. Быў час, калі ён быў вымушаны трэніравацца ў чужых лыжных бацінках, катацца на чужых лыжах. Яму проста не было за што набыць інвентар. Дапамагалі маладому спартсмену мама і першыя трэнеры — Віктар і Ала Шапоравы. Калі Леанід паступіў у Магілёўскае вучылішча алімпійскага рэзерву, Тамара Леанідаўна нават хатнія прадукты сыну ў горад пасылала...

Аднак зараз можна з упэўненасцю сказаць, што фінансавыя цяжкасці для Леаніда Карніенкі знікнуць. Падтрымка маладых спартсменаў — прэрагатыва Прэзідэнцкага спартыўнага клуба і асабіста Аляксандра Лукашэнкі. Усім прызёрам чэмпіянатаў свету ў нашай краіне аўтаматычна прысуджаецца так званая прэзідэнцкая стыпендыя. У сярэбраных прызёраў — гэта 100 тарыфных ставак, а адна стаўка на сённяшні дзень складае 65 тысяч беларускіх рублёў. Вось і памнажайце. А яшчэ, згодна з пастановай Савета міністраў, уладальніку сярэбранай узнагароды могуць налічыць да 250 базавых велічынь...

Зразумела, што пасля поспеху на маладога Леаніда Карніенку ўскладаецца дадатковая адказнасць. Да чарговай зімовай Алімпіяды яшчэ тры гады, аднак цалкам верагодна, што ўжо зараз чыноўнікі паспяшаюцца "залічыць" маладога спартсмена ў прызёры. У нас жа любяць усялякія медальныя планы. Але сам Карніенка пакуль пра алімпійскі медаль не думае, заўважаючы, што наперадзе яшчэ шмат працы. Яно і правільна. Для маладога спартсмена галоўнае — праца, а пры належнай самааддачы і медалі нікуды не дзенуцца.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.
Фота Уладзіміра ІВАНЕЎСКАГА.

МАЗАІКА

На чарговым этапе Кубка свету, які праходзіў у балгарскім Плоўдзіве, саблісты мужчынскай зборнай Беларусі занялі першае месца.

Тым часам у нямецкім Боне адбыліся спаборніцтвы рапірыстаў. Уладзімір Лышкоўскі заняў там 42-е месца, а Аляксандр Чалянкоў — 66-е.

У польскім Гданьску рапірыстка Наталля Краўчанка заняла 45-е месца.

***

На спаборніцтвах па тэнісе, якія прайшлі ў амерыканскім Лас-Вегасе (прызавы фонд — 75 тысяч долараў), беларускі дуэт у складзе Вікторыі Азаранка і Таццяны Пучак выйграў у фінале эстонска-італьянскі тандэм Марэт Ані — Альберта Брыянці.

***

На справаздачна-выбарнай канферэнцыі Федэрацыі футбола міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў заявіў, што нацыянальная зборная Беларусі павінна выйсці ў фінальную стадыю чэмпіянату Еўропы-2008.

Па словах спартыўнага міністра, "з улікам дзяржаўнай падтрымкі нашы футбалісты на міжнароднай арэне павінны выглядаць не горш, чым, напрыклад, баскетбалісткі альбо валейбалісткі".

Нагадаем, што самым значным дасягненнем беларускага футбола за апошнія гады быў выхад маладзёжнай зборнай у фінальную частку чэмпіянату Еўропы 2004 года.

Алесь НІКАНОРАЎ.

ЗАКУЛІСЬЕ

В Беларуси появилось первое спортивное агентство

Недавно в Республиканском центре спортивной медицины прошел семинар, посвященный медицинскому контролю за лицами, которые занимаются фитнесом. Один из докладов на семинаре делал руководитель "первого спортивного агентства" Александр Садовский.

"Народная воля" попыталась узнать, чем конкретно занимается "первое в Беларуси спортивное агентство", сотрудничает ли оно, например, с президентским спортивным клубом.

Репортер "Народной воли" адресовала свои вопросы **Александру Садовскому.**

Он сообщил, что агентство занимается *"созданием и продвижением в Республике Беларусь цивилизованной индустрии персонального спорта и фитнеса"*

"Профессиональный спортсмен — это человек, которого ничего не должно беспокоить, — говорит Садовский. — *Так вот, спортивное агентство создает условия для того, чтобы он четко, грамотно и своевременно выкладывался и достигал определенных результатов. Это то, что касается большого спорта. В области фитнеса приоритетными направлениями являются детско-юношеский спорт, спорт с трудными подростками. У нас есть задумка организовать секции в колониях с несовершеннолетними детьми, чтобы они там занимались спортом".*

Кто входит в состав руководства агентства, Садовский уточнять не стал.

"Думаю, не стоит перечислять конкретные фамилии, — сказал он. — *Это специалисты, которые раньше работали в системе профессионального спорта, бывшие спортсмены, юристы, экономисты. Большую часть жизни эти люди отдали спорту".*

"Первое спортивное агентство" пока никак не сотрудничает с президентским спортивным клубом, который, как известно, возглавляет **Дмитрий Лукашенко.**

"А с Министерством спорта у нас, так скажем, прямые контакты, — отметил Садовский, отвечая на вопрос "Народной воли". — *Потому что без государственного органа управления социальную политику невозможно в этой области проводить. Есть государственная программа о развитии физической культуры, спорта и туризма. В соответствии с ней мы и работаем. У нас есть совместные проекты. Например, мы уже провели пару детских спортивных мероприятий. В перспективе хотим провести в Минске республиканский конкурс "Лучший фитнес-клуб года".*

Как ни странно, но пока о появлении "первого спортивного агентства" слышали немногие.

"Дело в том, что сейчас мы проходим перерегистрацию, — объяснил Александр Садовский. — *В конце марта мы, надеюсь, получим новые учредительные документы и после этого уже будем более широко себя продвигать. Хотя, в принципе, мы известны среди профессионалов, мы не делаем ставку на широкую аудиторию обывателей. Мы пытаемся сделать так, чтобы те, кто уже занимается фитнесом и спортом, не ушли из этой системы. Мы выступаем за то, чтобы профессиональным спортсменам, которые защищают честь страны, были созданы такие условия, при которых они могли бы стабильно и результативно выдавать хорошие показатели на крупных соревнованиях. Основная наша обязанность — сделать так, чтобы спортсмены были социально адаптированы в обществе после окончания своей карьеры".*

Алиса НЕКОИНОВА.

ВМЕСТО КОММЕНТАРИЯ

Владимир ПАРФЕНОВИЧ, трехкратный олимпийский чемпион:

— Я первый раз от Вас слышу о "первом спортивном агентстве". Говорите, они занимаются поддержкой профессиональных спортсменов, их реабилитацией? Что-то никто не обращался ко мне с просьбами поддержать, в том числе и материально, не обращался. Поэтому мне с трудом во все это верится...

РАКУРС

Лицензия на фитнес

Не исключено, что в ближайшем будущем белорусские фитнес-центры не смогут работать без лицензии

Об этом на семинаре "Медицинский контроль за фитнесом" сказала заведующая отделением врачебного контроля Республиканского центра спортивной медицины **Галина Боник.**

О справках и агрогородках

"Конечно, очень радует, что в Минске и других городах Беларуси открываются фитнес-центры и тренажерные залы, — сказала Галина Александровна. — Но, например, в Петербурге все фитнес-клубы начинают свою работу с лицензирования. Без лицензии там давно никто не работает. И, на мой взгляд, это правильно. Думаю, в ближайшем будущем и наши белорусские клубы будут лицензированы.

Оказание фитнес-услуг без медицинского наблюдения невозможно. И если на занятие приходит человек без медицинской справки о состоянии здоровья и допуска к занятиям, ни один клуб не имеет права допускать его к занятиям.

Недавно мы по поручению Министерства спорта побывали в агрогородках и выяснили, что даже если там и есть какие-то залы для занятий, то зачастую занятия проходят на уровне самодеятельности, а это недопустимо. Ни о каком медицинском допуске там речь вообще не идет...

Честно говоря, меня радует, что в последнее время нам довольно часто звонят из фитнес-клубов и спрашивают, можно ли с таким-то заболеванием заниматься тем или иным видом спорта..."

О смерти на уроке физкультуры

Отделение врачебного контроля в Республиканском центре спортивной медицины было создано 10 лет назад. "Сразу после того, как практически одновременно на уроках физкультуры в школах и вузах произошло несколько смертельных случаев — погибло 4 учащихся, — говорит Галина Александровна. — Только представьте: дети занимались организованно, под наблюдением преподавателя, и тем не менее всего какой-то урок физкультуры стал для них последним... А все почему? Потому что десять лет назад никто не знал такого понятия, как медицинский контроль на занятиях. Пока речь не зашла о человеческих жизнях... Согласитесь, что, отправляя ребенка в школу, каждый надеется, что он вернется домой здоровым. Поэтому на ошибках, тем более таких серьезных, надо учиться..."

О здоровом образе жизни

Галина Боник считает, что прививать любовь к здоровому образу жизни нужно с самого детства.

"Тогда физкультура становится для детей правилом и нормой жизни и они не представляют, как без нее жить, — говорит Галина Александровна. — Например, мы недавно проводили анкетирование в столичной школе №186 с физкультурно-оздоровительным уклоном, которая находится в Шабанах. Все классы этого учебного заведения ежедневно занимаются физкультурой, кроме того, по субботам у них проводятся различные спортивные мероприятия. И представьте себе — там никто не курит и не пьет!

На мой взгляд, чем раньше человек начнет заниматься, тем больше пользы будет для его здоровья. Физическая активность укрепляет организм, продлевает жизнь и замедляет процессы старения.

Ольга ПРУДНИКОВА.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Нам сапраўды не хапае вас!

Яшчэ раз скажам шчыра: фінансавая сітуацыя газеты палепшылася б, калі б яе прыхільнікаў было на тысячы тры-чатыры болей. Таму ў нас вялікая просьба да сталых чытачоў: дапамажыце, калі ласка, загітаваць тых, хто ў бліжэйшы час змог бы зрабіць **перадаплату** за будучыя нумары. Калі грошы будуць пералічаны ў бліжэйшыя дні, то мы зможам аператыўна даслаць нават першыя сакавіцкія нумары. Дзеля гэтага мы і друкуем сёння ўзоры плацежкі і абаненцкай карткі. Дарэчы, яны патрэбны і тым, хто спазніўся з перадаплатай за сакавіцкія нумары, але хоча бесперабойна атрымліваць іх. Не ўпусціце свой шанц.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ВЫБОРЫ

Геннадию Невыгласу добавили 4 года

Отчетно-выборная конференция ассоциации "Белорусская федерация футбола", состоявшаяся в минувшее воскресенье, не принесла неожиданных результатов. Председатель БФФ Геннадий Невыглас (который к тому же и глава Администрации президента) был переизбран на новый четырехлетний срок.

Кандидатура Геннадия Невыгласа была безальтернативной и за нее проголосовало подавляющее большинство членов отчетно-выборной конференции. Впервые Г.Невыглас возглавил белорусский футбол в 2003 году, сообщает БелаПАН. Тогда он занимал должность государственного секретаря Совета безопасности. Процедура избрания сопровождалась осложнением отношений с ФИФА и УЕФА. Международная и европейская федерации футбола заявляли о вмешательстве государства в дела БФФ и отходе белорусской стороны от договоренностей. В декабре 2002 года выборы не состоялись по причине нарушения порядка выдвижения делегатов на отчетно-выборную конференцию, которая первоначально должна была пройти в августе. В марте 2003 года ФИФА и УЕФА не признали избранное на новой конференции руководство БФФ во главе с Г.Невыгласом из-за несоблюдения сроков ее проведения. В июне стороны достигли компромисса, итогом которого стало подтверждение в октябре того же года полномочий Г.Невыгласа на очередной внеочередной конференции.

Пост первого заместителя председателя занял Виктор Новиков, а Михаил Вергеенко, Сергей Куница и Петр Южик — посты заместителей.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 7.03.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №